ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАНЬНЯ XV
№ 152 (4404)
Субота, 9 ліпеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая, 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ — ПЕРАДАВЫ: За шырокае разгортваньне таваразвароту паміж горадам і вёскай. Т. БРОЎКІН, С. ЛЕЙТАС, Б. ФАРБЭР.—Пастаянная калгасная брыгада вырашае посьпехі ўборачнай. (2 стар.).

Пастановы прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР: Аб аслабаненьні тав. Калініна А. Я. ад абавязкаў народнага камісара рабоча-сялянскай інспэкцыі БССР і аб назначэньні тав. Лычова народным камісарам рабоча - сялянскай інспэкцыі БССР (1 стар.).

Назначэньне тав. Рачыцкага ўпаўнаважаным СНК БССР і ЦК КП(б)Б па правядзеньні ўборачнай кампаніі — Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б (1 стар.).

Парадак карыстаньня лясными сенажацямі — Пастанова Савету Народных Камісараў БССР (1 стар.).

Ад тэмпаў сенаўборкі залежаць посьпехі стварэньня моцнай кармовай базы (1 стар.).

ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Парыскія «нищейки» аскандаліліся (4 стар.). Белабандыты на Прасчім антысавецкім зьлёце (4 стар.). Саветы ў Чылі (4 стар.).

За шырокае разгортваньне таваразвароту паміж горадам і вёскай

Гістарычныя пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК аб збожжа, жывёлазагатоўках і калгасным гандлі выцякаюць з ленінскай палітыкі нашай партыі. Гэтыя пастановы непарыўна зьвязаны з дырэктывамі XVII партканфэрэнцыі аб разгортваньні таваразвароту, павялічэньні норм душавога спажываньня, аб разьвіцьці савецкага гандлю. Яны таксама выцякаюць з рашэньняў аб арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Калгасны гандаль—важнейшая сустаўная частка савецкага гандлю, магутны фактар разгортваньня таваразвароту паміж горадам і вёскай.

Неабходнасьць па-бальшавіцку рухаць уперад вырашэньне гэтай задачы вынікае з **першаступеннага** значэньня разгортваньня таваразвароту для забесьпячэньня бальшавіцкіх тэмпаў уздыму ўсёй народнай гаспадаркі і лепшага задаваленьня попыту шырокіх мас гораду і вёскі ў адносінах тавараў шырокага спажываньня (XVII партканфэрэнцыя).

Шырокае разгортваньне калгаснага гандлю дазволіць нам ня толькі сабраць наяўныя таварныя лішкі с.-г. прадукцыі звыш цэнтралізаваных загатовак, але будзе **стымуляваць** стварэньне новых дадатковых рэсурсаў, **«выклікаць да жыцьця»** ўсё большую колькасьць прадукцыі, павышаючы тым самым таварнасьць калгаснай гаспадаркі, узьнімаючы дабрабыт калгасьніка, няўхільна паляпшаючы рабочае снабжэньне.

Іменна таму масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў сустрэлі апошнія пастановы партыі і ўраду ўздымам вытворча-палітычнай актыўнасьці, павышэньнем тэмпаў барацьбы за плян бальшавіцкай сяўбы.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, які гэтымі днямі адбыўся, у вялікім дакладзе **тав. Рыскіна** і ў спрэчках, якія разгарнуліся, падвёў папярэднія вынікі ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК і СНК Саюзу ў нашай рэспубліцы і вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы па разгортваньні калгаснага гандлю, вырабу тавараў шырспажыву і прасоўваньні гэтых тавараў на вёску.

Адзначаючы наяўнасьць першых станоўчых вынікаў на разгортваньні гандлю с.-г. прадукцыі, пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б з усёй рашучасьцю пад крэсьлівае, што рэалізацыя дырэктыў партыі і ўраду на гэтым пытаньні праходзіць **яўна нездавальняюча.**

Слабая масава-растлумачальная работа, няма належнай мабілізацыі сіл мясцовых партарганізацый, савецкіх устаноў (РВК, гарсаветы), калгасных, вямельных арганізацый на вырашэньне канкрэтных задач разгортваньня гандлю с.-г. прадуктамі. Не праяўляюць патрэбнай паваротлівасьці каапэрацыйна-гандлёвыя арганізацыі ў наладжаньні сустрэчнага гандлю прамтаварамі, у барацьбе са спэкулянтам - перакупшчыкам. Зусім павольна разгортваецца выраб прадметаў шырокага спажываньня. Наркамлёгпрам, прамысловая каапэрацыя і іншыя гаспадарчыя ўстановы не забясьпечылі выкананьня раной вызначаных ЦК і СНК БССР мерапрыемстваў па вырабе тавараў шырокага спажываньня, недапушчальна павольна разгортваюць гэту работу.

Прычына нездавальняючай работы заключаецца **галоўным чынам у недаацэнцы** радам партыйных, савецкіх, гаспадарчых і каапэрацыйных арганізацый велічыні палітычнай важнасьці, эканамічнага значэньня сумы паказаных мерапрыемстваў.

У практыцы работы асобнымі раённымі, савецкімі арганізацыямі і ўстановамі дапушчаны грубыя скажэньні дырэктыў партыі як праваапартуністычнага, так і «лявацкага» парадку.

У **Гомелі, Барысаве, Бабруйску, Чырвонапольлі, Горках** мелі месца спробы бюракратычнай рэгляментацыі калгаснага гандлю, адміністраваньне ва ўстанаўленьні цэн, прымацаваньне калгасаў да каапэрацый і факты простай забароны калгасьнікам, якія акуратна выконваюць свае абавязацельствы перад дзяржавай, прадаваць лішкі сваёй прадукцыі.

З другога боку праяўляюцца праваапартуністычныя тэндэнцыі проціпаставіць калгасны гандаль цэнтралізаванаму пляну, разгортваць гандаль с.-г. прадуктамі за лік невыкананьня гэтага пляну.

Пленум завастрыў увагу ўсёй партарганізацыі на неабходнасьці весьці бязьлітасную барацьбу на два фронты, перасякаючы ў корані малейшыя скажэньні прынцыпаў савецкага гандлю.

Толькі праз бальшавіцкае перамаганьне апартуністычнага супраціўленьня ляжыць шлях да шырокага разгортваньня таваразвароту паміж горадам і вёскай.

У дакладзе сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Рыскіна** і спрэчках надзвычай вялікае месца аддана пытаньню вырабу тавараў шырокага спажываньня і прасоўваньня іх у вёску.

Насычэньне вёскі прамысловымі **таварамі—адна з важнейшых прадпасылак** разгортваньня гандлю с.-г. прадуктамі.

Выходзячы з гэтага аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК абавязаў гаспадарчыя арганізацыі поўнасьцю выканаць зацьверджаную бюро ЦК (на другое паўгодзьдзе) дадатковую праграму вырабу тавараў шырокага спажываньня на суму 30.605.480 руб., лічачы гэту праграму **мінімальнай.**

Вялізарнейшую работу ў сувязі з гэтым абавязаны разгарнуць партыйныя арганізацыі і гаспадарнікі лёгкай прамысловасьці і прамкаапэрацыі, на долю якіх прыпадае амаль тры чвэрткі вызначанага пляну.

Барацьба за рэалізацыю прынятай пленумам праграмы зьяўляецца **пачэснай справай** кожнай вытворчай партарганізацыі, кожнага камуніста і камсамольца, кожнага рабочага. Посьпехі залежаць ад таго, наколькі на справе гэта задача будзе пастаўлена, **як адна з важнейшых** у гаспадарчай і партыйнай рабоце на прадпрыемстве, наколькі поўна будуць выкарыстоўвацца адкіды і шырока развіты рацыяналізатарскі рух у гэтым напрамку.

Змагаючыся за выкананьне дадатковай праграмы, трэба даваць моцны **бальшавіцкі адпор** апартуністычным спробам у якой-бы там ні было меры паслабіць барацьбу за асноўную праграму.

Насычэньне вёскі прамтаварамі шырокага спажываньня залежыць ня толькі ад размаху работы па іх вырабу, але ў вялікай меры ад таго, **як яны будуць прасоўвацца ў вёску,** як арганізаваны гандаль імі.

Тавараправодзячая сетка БССР і, у прыватнасьці, спажыўсыстэма, **зьверху да нізу нездавальняюча** спраўляецца з гэтай работай.

Справа ня толькі ў недахваце тавараў. **«Часта бязьдзейнасьць, няўменьне арганізаваць савецкі гандаль прыкрываюць агульнымі размовамі «тавараў мала». Так, у нас не хапае тавараў, попыт нязвычай узрос. Але гэта няпраўда, што ў нас тавараў ма ла. Вялізарныя масы тавараў мы з вамі ня ўмеем яшчэ па-сапраўднаму і правільна давесьці да спажыўца»** (Каганові́ч).

Тав. **Рыскін,** а за ім удзельнікі пленуму дзесяткамі фактаў (аб замарожваньні таваразвароту, няправільным разьмеркаваньні тавараў) ілюстравалі такое становішча.

Пленум паставіў перад мясцовымі партыйнымі арганізацыямі і перад Белкаапсаюзам задачу—**неадкладна да біцца рэзкага ўзмацненьня гандлёвай дзейнасьці сельспажыўтаварыства,** як рашаючага зьвяна спажывецкай сыстэмы, палепшыць якасьць яго работы, узмацніць кадрамі.

Спажывецкая каапэрацыя і асабліва яе сярэдняе (райсаюз) і нізавое зьвяно абавязаны навучыцца гандляваць ня толькі таварамі, што паступаюць у цэнтралізаваным парадку, але пашырыць таваразварот за кошт прадметаў сельскага спажываньня, цясьней зьвязацца з прамкаапэрацыяй і на аснове ўліку патрэб спажыўца, умоў кожнага раёну прад'яўляць патрабаваньні прамысловым прадпрыемствам у адносінах асартымэнту, якасьці і колькасьці вырабляемых тавараў.

Пленум ЦК вызначыў рад канкрэтных мерапрыемстваў, ажыцьцяўленьне якіх павінна забясьпечыць правільную арганізацыю калгаснага гандлю на базарах, стварэньне ўласнай гандлёвай сеткі, далейшае зьніжэньне цэн, выкараненьне ажыятажу, і перакупкі—спэкуляцыі.

У прыватнасьці, гарсаветы і РВК абавязаны ў 2-хтыднёвы тэрмін устанавіць дні базару, прывесьці ў адведны выгляд рынкавыя плошчы і пад'язныя шляхі, пабудаваць ларкі і палаткі, арганізаваць на рынках чайныя, цырульні, бюро даведак і г. д.

У наладжаньні культурнага гандлю на савецкім рынку важнейшае месца павінна заняць барацьба са спэкулянтам-перакупшчыкам. Выкараненьне прыватнага гандляра, які прабуе пажыцца за кошт гандлю с.-г. прадуктамі, павінна ісьці як па лініі **ўзмоцненай дзейнасьці фінансавых органаў,** так і арганізацыі работы спажывецкай каапэрацыі па абслугоўваньні таварамі калгасьніка і працоўнага аднаасобніка.

Падкрэсьліваючы гэта, пленум разам з тым абавязаў усе зьвенні каапэрацыі перанесьці самазагатоўкі ў глыбінныя пункты, **выкараніць** самым рашучым чынам ажыятаж, таваравымен, які разбураюць рынак і палягчаюць дзейнасьць спэкулянтаў.

Пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб разгортваньні калгаснага гандлю і шырспажыве трэба панесьці ў масы, растлумачыўшы кожнаму рабочаму, кожнаму калгасьніку і працоўнаму аднаасобніку іх сутнасьць і значэньне.

Шырокай папулярызацыяй апошніх пастаноў партыі і ўраду, бальшавіцкай барацьбой партарганізацый, прафсаюзаў і камсамолу за ажыцьцяўленьне кожнага пункту мерапрыемстваў, вызначаных пленумам, забясьпечым сапраўды шырокае разгортваньне і ўсямернае паскарэньне таваразвароту паміж горадам і вёскай.

ВЫВЕСЬЦІ БУЙНЕЙШЫЯ ЗАВОДЫ АСІНТОРФ, „ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ", „БАЛЬШАВІК" І „ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ" З ГЛЫБОКАГА ПРАРЫВУ ПА ТОРФАЗДАБЫЧЫ

Здабыча торфу заводамі Белторфаб'яднаньня

(У тонах і процантах)

1 ліпеня	2 ліпеня	3 ліпеня	4 ліпеня	5 ліпеня
3658	4284	2772	4725	5795
43,4	50,5	33,1	56,3	69,1

заводамі мясцовай прамысловасьці Наркамлёгпраму

28 чэрв.	29 чэрв.	30 чэрв.	1 ліпеня	2 ліпеня
450	357	500	586	498
47,0	44,8	49,0	54,0	45,8

Замест 54 тысяч тон здабыта толькі 31 тысяча

Торфзаводамі Наркамлёгпраму без мясцовай прамысловасьці за два месяцы сэзону (май і чэрвень) усяго здабыта 31.843 тоны торфу, з іх машынафармоўчанага 31.081 тона і фрэзэрнага —762 тоны. Усяго-ж па пляне за два месяцы павінна быць здабыта 54.772 тоны. Такім чынам каляндарнае задань не выкананa толькі на 58,1 проц.

Уперадзе ўсіх ідуць заводы **«Чырвоны тарфянік»,** які заданьне па машына - фармоўчым торфе за два месяцы выканаў на 112,8 проц., агульны каляндарны плян — на 71,4 проц., **«Ленінскі шлях»** — на 81,1 проц., **«Чырвоны Кастрычнік»** — на 56,1 проц. Адстаюць заводы **«Міхалавічы»,** які каляндарны плян выканаў толькі на 42,7 проц., **«Камунар»** —на 47,6 проц. і **«Зьвязда»** — на 51,6 проц.

Для стымуляваньня торфаздабычы ў ліпені з мэтай ліквідацыі заназычанасьці ранейшага пэрыяду, і поўнага выкананьня агульнай праграмы, калегія Наркамлёгпраму вызначыла перадавым заводам прэміяльны фонд у разьмеры 3 тысяч руб. і месцы па курорт і дамы адпачынку, для лепшых ударнікаў.

Зрух далёка невыстарчальны

Першая пяцідзённка ліпеня ў торфаздабычы дала некаторае павышэньне тэмпаў. Калі за апошнія пяць дзён чэрвеня заводамі Белторфу было здабыта 15.036 тон торфу, то за першую пяцідзённку ліпеня 21.034 тоны. Асабліва рэзкае павышэньне тэмпаў дасягнута па фрэзэрнай здабычы: за 5-та ліпеня сутачнае заданьне выкананa на 86 проц.

Аднак, даны зрух зьяўляецца далёка невыстарчальным. Ён ня толькі не забясьпечвае ліквідацыі заназычанасьці першых двух месяцаў, але і кажа поўнага выкананьня сутачнай праграмы: 5-га ліпеня ўпяршыню дзённы плян па заводах Белторфу выкананa усяго на 69,1 проц.

Калі ўзяць асобныя заводы, дык многія з іх ўсё яшчэ знаходзяцца ў глыбокім тыле торфаздабычы. Так, завод «Чырвоная Беларусь» сутачную праграму за 5-е ліпеня выканаў на 65,9 проц., «Шлях сацыялізму»—на 65,3 проц., «Бальшавік»—на 57,5 проц., Асінторф—на 53,9 проц., «Чырвоны сьцяг»—на 49,3 проц., «Свабода»—на 48 проц. Толькі заводы «Закрашынскі мох» і «Смалявічы» сыстэматычна перавыконваюць свае сутачныя заданьні.

Ліпень — найбольш спрыяючы месяц для торфаздабычы, асабліва для здабычы фрэзэрнага торфу. Добрае надвор'е дае магчымасьць скараніць працэс сушкі, паскорыць складаньне торфу ў штабэлі і гэтым самым ачысьціць палі сьцілкі ад залежаў, якія накапіліся за папярэднія месяцы. Гэта абавязвае ўсе арганізацыі тарфянай прамысловасьці прыняць рашучыя меры для таго, каб у бліжэйшыя дні поўнасьцю ліквідаваць адставаньне і забясьпечыць пасьняховае выкананьне сэзоннай праграмы. Правільная расстаноўка рабочай сілы, арганізацыя працы рабочых, паляпшэньне матар'яльна-бытавога і культурнага абслугоўваньня тарфянікаў і тарфяніц, шырокае разгортваньне палітычна-масавай работы і сацыялістычных форм працы —сацыяборніцтва і ўдарніцтва—зарука перамогі.

Культурна-бытавое абслугоўваньне тарфянікаў на заводзе „Свабода"— закінуты вучастак

Культурнае і бытавое абслугоўваньне рабочых торфзаводу «Свабода» зьяўляецца адным з самых адсталых вучасткаў. Калі-б заводзкія арганізацыі аддалі належную ўвагу падцягваньню гэтага вучастку, «Свабода» вышла-б на першае месца на выкананьні пляну здабычы торфу.

Тарфком ніякай арганізацыйнай і культурнай работы не праводзіць. Часамі выпаўзуць работнікі тарфкому на балота паглядзець, як ідзе работа, часамі зьявяцца ў сталоўцы, у большасьці-ж яны адпачываюць на «лаўрах», як быццам барацьба за выкананьне плянаў торфаздабычы іх не датычыць.

Пам. дырэктара заводу па працы ў свой час інфармаваў, што «Свабода» на 104 проц. забясьпечана рабочай сілай. У сапраўднасьці-ж такая колькасьць рабочых не завербавана. Затрачана шмат грошай, а плян выкананы толькі на паперы. Частка завербаваных зусім не зьявілася, частка з малалетніх пакінула работу. Ніякіх мер супроць цякучасьці рабочай сілы, для паляпшэньня вярбоўкі ня прынята. Пам. дырэктара па працы замкнуўся ў габінэце і чакае пакуль Белторф прышле надзейных вярбоўшчыкаў. На сёньняшні дзень брыгады поўнасьцю не ўкамплектаваны, што перашкаджае выкананьню пляну.

Агідна дрэнна працуе тарфяная каапэрацыя. Торфрабкоп не падрыхтаваўся да тарфянога сэзону. Работа сталоўкі заслугоўвае самага суровага асуджэньня. Самазагатоўкі не праведзены, сьвінаадкормачныя і трусагадоўчыя пункты не арганізаваны. Ня гледзячы на дагаворанасьць аб вылучэньні стала для лепшых ударнікаў, сталоўка яго не арганізавала. У сталоўцы гуркоў ня было, а 12 бочак гуркоў згнілі.

Для таго, каб узьняць тэмпы торфаздабычы па заводзе «Свабода», неабходна перабудаваць работу тарфкому і торфрабкопу. Культурна - бытавому абслугоўваньню рабочых павінна быць аддана належная ўвага.

К. К.

Пастанова прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

АБ АСЛАБАНЕНЬНІ ТАВ. КАЛНІНА А. Я. АД АБАВЯЗКАЎ НАРОДНАГА КАМІСАРА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ІНСПЭКЦЫІ БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

У сувязі з ад'ездам тав. **КАЛНІНА** Аўгуста Янавіча, на іншую работу, аслабаніць яго ад абавязкаў Народнага Камісара Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
7 ліпеня 1932 г., Менск. **М. ГНІЛЯКЕВІЧ.**

Пастанова прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

АБ НАЗНАЧЭНЬНІ ТАВ. ЛЫЧОВА НАРОДНЫМ КАМІСАРАМ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ІНСПЭКЦЫІ БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Назначыць тав. **ЛЫЧОВА** Народным Камісарам Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
7 ліпеня 1932 г. г. Менск. **М. ГНІЛЯКЕВІЧ.**

VII усесаюзная канфэрэнцыя ЎсеЛКСМ

Сем брыгад імя сёмай усесаюзнай

Прывітаньне ад камсамольскай арганізацыі Рурскай вобласьці сёмай канфэрэнцыі ЎсеЛКСМ

ЭСЭН, 30 чэрвеня 1932 г.

Дарагія таварышы!

Вашай канфэрэнцыі, скліканай пад знакам пераможнага выкананьня першай пяцігодкі за чатыры гады, пад знакам пастаноўкі задач на другую пяцігодку і мабілізацыі ўсёй рабочай моладзі на барацьбу ў абарону ад імпэрыялістычных разбойнікаў, якія замышляюць вайну супроць краіны сацыялізму, **перадаем мы палкае баявое прывітаньне ад камсамольцаў і рэвалюцыйнай рабочай моладзі Рурскай вобласьці.**

У рамках антыфашысцкай барацьбы мы праводзім зараз кампанію па выбарах у рэйхстаг на базе шырачэзнага стварэньня адзінага фронту і мацнейшай папулярызацыі дасягненьняў Савецкага саюзу ў пытаньнях, якія закранаюць рабочых і сялянскую моладзь. У барацьбе за заваяваньне большасьці рабочай моладзі мы будзем процістаўляць адну другой дзьве сусьветныя сыстэмы (сацыялізм і капіталізм) і паказам вашых дасягненьняў у сацыялістычным будаўніцтве выклікаем павышэньне рэвалюцыйнай актыўнасьці маладых рурскіх гарнякоў у барацьбе супроць імпэрыялістычнай вайны.

Усьвядамляючы значэньне вашай канфэрэнцыі для нямецкага камуністычнага, і асабліва для Рурскай вобласьці, **мы даем абавязацельства стварыць сем ударных брыгад імя сёмай усесаюзнай канфэрэнцыі ЎсеЛКСМ, якія будуць паведамляць аб сваёй рабоце ў ЦК КСМГ і ў «Комсомольскую правду».**

Мы лічым, што ваша канфэрэнцыя будзе азначаць значны этап у гістарычным удзеле ЎсеЛКСМ у пабудове сацыялізму і зітаем вас галавым:

— «Рот фронт»!

Ад імя камсамольцаў Рурскай вобласьці АКРУГОВАЕ КІРАЎНІЦТВА КАМСАМОЛУ РУРСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ.
Германія.

АД ТЭМПАЎ СЕНАЎБОРКІ ЗАЛЕЖАЦЬ ПОСЬПЕХІ СТВАРЭНЬНЯ МОЦНАЙ КАРМОВАЙ БАЗЫ

Назначэньне тав. Рачыцкага ўпаўнаважаным СНК БССР і ЦК КП(б)Б па правядзеньні ўборачнай кампаніі

Пастанова Савету народных камісараў БССР і ЦК КП(б)Б

Надаючы выключна важнае значэньне справе падрыхтоўкі і правядзеньню ўборачнай кампаніі і ў сувязі з неабходнасьцю ўстанаўленьня апэрацыйнага кіраўніцтва гэтай работай і хуткага выкананьня ўсіх пытаньняў, зьвязаных з уборачнай кампаніяй, Савет народных камісараў БССР і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць назначыць народнага камісара земляробства БССР тав. Рачыцкага ўпаўнаважаным СНК БССР і ЦК КП(б)Б па правядзеньні ўборачнай кампаніі і азімай сяўбы 1932 г., а намесьнікам упаўнаважанага назначыць тав. Масюкова.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар ЦК КП(б)Б
М. ГІКАЛО.

8 ліпеня 1932 г.
г. Менск

Парадак карыстаньня лясными сенажацямі

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Для ліквідацыі непаразуменьняў, якія ёсьць да гэтага часу пры карыстаньні сенажацямі, што знаходзяцца сярод лясных дач, Савет народных камісараў БССР пастанаўляе:

1. Усе сенажаці, перададзеныя саўгасам, калгасам і аднаасобнікам, якімі гэтыя зямлякарыстальнікі фактычна пачалі карыстацца да выданьня пастановы СНК БССР за 10 мая 1931 г. «Пра арганізацыю гародаў і загатоўку фуражу ў леспрамгасах» (ЗЗ БССР, 1931 г. № 20, паст. 163), пакінуць у іх карыстаньні на далейшы час.

2. Сенажаці, якія застануцца ў лясных дачах вольнымі пасьля задаваленьня патрэб у кармох лясного транспарту сенажаці ў лясных дачах, праверыць забясьпячэньне сенажацямі саўгасаў і калгасаў і, калі ёсьць лішкі, перадаць апошнія леспрамгасам незалежна ад таго, дзе гэтыя сенажаці знаходзяцца: у лясных дачах ці па-за межамі іх.

4. Для вырашэньня ўсіх пытаньняў, зьвязаных з карыстаньнем лясными сенажацямі і забясьпячэньне леспрамгасаў сенажацямі па-за межамі лясных дач, стварыць пры раённых выканаўчых камітэтах (гарадзкіх саветах) камісіі ў складзе: старшыні раённага выканаўчага камітэту (гарадзкога савету), старшыні раённага калгассаюзу і дырэктара лес прамгасу. Пастановы гэтай камісіі лічацца канчатковымі.

5. Катэгарычна забараніць леспрамгасам раздаваць аднаасобнікам або калгасам сенажаці за вывазку лесу або па часьць.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР — М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік Скарбу Савету Народных Камісараў і Эканамічнага савету БССР — С. КАНДЫБОВІЧ.

8 ліпеня 1932 г.
г. Менск.

ПРАПОЛКА ІЛЬНУ (калгас «Чырвоны гігант», Глускага раёну)

МАКСЫМАЛЬНА ФАРСАВАЦЬ УБОРКУ НАТУРАЛЬНЫХ СЕНАЖАЦЯЙ

10 ліпеня — кантрольны тэрмін, вызначаны НКЗ для скапчэньня ўборкі першага ўкосу заліўных балотных і штучных сенажацый па ўсёй БССР.

Ход сенаўборкі па 37 саўгасах Менскага трэсту «Сьвінавод» на 5 ліпеня не гарантуе выкананьня ў тэрмін заданьня партыі і ўраду. Гэта падцьвярджаюць лічбы і факты, атрыманыя за апошнія дні непасрэдна з саўгасаў.

З 7.830 га натуральных сенажацый скошана 935 га—11,9 проц. З 2.549 га канюшыны скошана 1.386—54,4 проц.

Рад саўгасаў (Сінча, Мсьціж, «Беларусь», «Камсамолец», Харомцы) не пачынаюць уборкі натуральных сенажаній і ўсё чагосьці чакаюць.

Саўгасы **«1 мая» і «Курганы»,** Менскага раёну, маюць пізначныя вучасткі сенажацый — па 5-10 га. Каб забясьпечыць стада грубымі кармамі, гэтым саўгасам дадаткова адведзены вучасткі на Загальскім масыве. Туды трэба перакінуць рабочую сілу і інвэнтар. Гэта даволі складаная апэрацыя, якая патрабуе праяўленьня максымуму энэргіі і паваротлівасьці. Але гэтыя саўгасы яшчэ не пачалі нават убіраць сенажаці ў сябе ў гаспадарцы, не гаворачы ўжо аб «Загалілі».

Саўгасы Сьвінавода забясьпечаны сенаўборачнымі машынамі ў выстарчальнай колькасьці. Жаночай рабочай сілы для зграбаньня сена таксама хопіць. **Адчуваецца вельмі востры недахоп касцоў.**

Выхад з гэтага становішча трэба шукаць у правільнай арганізацыі працы на сенажацях і вярбоўцы рабочай сілы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў на аснове гаспаадрчай узаемадапамогі.

У справе арганізацыі працы на саўгасных сенажацях мы сьцерагаем памылкі, якія былі дапушчаны ў часе сяўбы — гэта няправільнае стварэньне брыгад, дзе ўсе працуюць «скопам», дзе няма ўліку працы кожнага, дзе ў брыгадзе пануе ўраўнілаўка самага горшага віду.

Правільная арганізацыя брыгад, разьбіўка іх на дробныя групы па 3 чал. у кожнай у саўгасе **«Рыме»** (Капыльскі раён) на другі-ж дзень дала значны эфэкт. Паводле норм трэсту тры касцы на працягу дня павінны скасіць 1 га. Калі раней ні адна брыгада ў саўгасе ня выконвала нормы, дык пасьля правільнай расстаноўкі рабочай сілы тры лепшыя групы перавыканалі норму і замест аднаго га скошвалі па 1,36 га. Астатнія групы выканалі сваю норму. Гэты факт характэрны ня толькі для саўгасу «Рыме».

Што перашкаджае вярбоўцы рабочай сілы для сенаўборкі ў саўгасах Сьвінавода. Першае — недацэнка гэтага мерапрыемства як трэстам, так і дырэктарамі і грамадзкімі арганізацыямі саўгасаў.

Дырэкцыя трэстаў дагэтуль ня ведае колькі рабочай сілы не хапае для сенаўборкі па ўсіх саўгасах і па кожнай гаспадарцы ў паасобку.

На цякучасьць рабочай сілы, нездавальняючую вярбоўку яе ў значнай ступені ўплывае неарганізаванасьць грамадзкага харчаваньня. Тут трэба проста сказаць, што многія дырэктары і грамадзкія арганізацыі саўгасаў упарта ігнаруюць дырэктыву партыі аб арганізацыі пры сталовых малочных фэрм, сьвінаадкормачных пунктаў і трусатнікаў. Для гэтага ёсьць ўсе ўмовы, няма толькі ініцыятывы і жаданьня перамагчы цяжкасьці.

Прыкладам возьмем саўгас **«Веснава»** (Глускі раён). Дырэктар **т. Бухонка** на сходзе рабочых, прысьвечаным гадавіне прамовы тав. Сталіна імкнуўся давесьці, што арганізаваць малочную фэрму пры сталовай ні ў якім разе немагчыма, бо няма дзе ўзяць кароў. Але самі рабочыя тут жа выкрываюць гэтую апартуністычную тэорыю і практыку. Аказваецца, 15 рабочых саўгасаў пядаўна набылі для сябе кароў для індывідуальнага карыстаньня. Чаму-ж гэтага ня можа зрабіць саўгас?

Дырэктар саўгасу **«Кухцічы»** (Вузнадзенскі раён) **Вілейка** спэцыяльна пры ехаў у Менск дабівацца, каб яму дазволілі на летні час скарыстаць для харчаваньня частку таварнай малочнай прадукцыі. Але за тое Вілейка нічога не зрабіў, каб арганізаваць пры сталоўцы малочную фэрму.

У дрэнным забесьпячэньні некаторых саўгасаў ня менш вінавата і саўгасная секцыя Белкаапсаюзу. Напрыклад у саўгасе «Веснава» рабочыя 5 месяцаў не атрымлівалі цукру ў той час, як дзяржавай гэты цукар для саўгасаў адпушчан. Такіх прыкладаў можна прывесьці ня мала.

Зусім нездавальняюча пастаўлена ў часе сенаўборкі партыйна - масавая работа. Саўгаскія партыйныя ячэйкі і рабачкомы пасьля сяўбы, відаць так сама рашылі адпачыць. Сацыялістычнае спаборніцтва на сенажацях паміж брыгадамі, паміж саўгасамі не арганізавана. Насьценгазэты і штодзенкі, якія ў часе веснавой сяўбы праявілі вялікую актыўнасьць і ва многіх мясцох здолелі мабілізаваць рабочыя калектывы, зараз маўчаць.

Першая палова ліпеня вырашае посьпех сенаўборкі ў саўгасах і калгасах. Ад тэмпаў работы на сенажацях, правільнага скарыстаньня рабочай сілы і машын, у бліжэйшыя 10 дзён залежыць сваячасовая ўборка сена і забесьпячэньне стада грубымі кармамі на зіму.

Саўгасы Сьвінавода, улічыўшы ўрокі мінулай вясны, павінны крута ўзьняць тэмпы сенаўборкі. **Да 10 ліпеня не пакінуць ніводнага гэктара няўбранай канюшыны.** Максымальна фарсаваць уборку натуральных сенажацый. Нельга марна траціць ніводнага дня, ніводнай гадзіны. Час не чакае!

9-га ліпеня, у 6 з палов. гадзін вечара, у летнім тэатры саду «Прафінтэрн» **склікаецца**

ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б разам з партактывам Менскай гарадзкой партарганізацыі.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Вынікі ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б (Дакл. т. **Шаранговіч**).
2. Арганізацыйныя пытаньні.

Члены ЦК, ЦКК, гаркому і гар.КК праходзяць на пленум па сваіх мандатах.

Сакратаром парткалектываў і партячэек атрымаць білеты на пленум 8 і 9-га ліпеня з 10-ці гада. раніцы да 4-х гада. дня у памяшканьні Менгаркому КП(б)Б, пакой № 4.

Менгарком КП(б)Б.

III-я сэсія ЦВК БССР X скліканьня

Саўгасы і калгасы засеялі 60,6 проц. усёй пасеўнай плошчы БССР

З дакладу наркамзема БССР тав. Рачыцкага

Раней чым перайсьці да непасрэднай тэмы свайго дакладу тав. **Рачыцкі** спыняецца на тым этапе, які БССР прайшла за час свайго вызваленьня ад белапалякаў.

За гэты час узмоцненай барацьбы, рабочай клясы і ўсіх працоўных БССР, пры дапамозе Савецкага саюзу, пя толькі адбудаваны гарады і мястэчкі, фабрыкі і заводы, якія былі разбураны ў часе імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны, але і пабудаваны новыя індустрыяльныя гіганты, як Асінбуд, Гомсельмаш, фабрыка штучнага валакна ў Магілеве, фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» ў Віцебску і інш.

Пя менш вялізарныя нашы дасягненьні і ў галіне сельскай гаспадаркі. Калі ў 1916 г. Беларусь мела 2 млн. 390 тысяч га пасеўнай плошчы, а ў 1920 годзе пасьля вызваленьня БССР ад белапалякаў і таго менш, **дык у гэтым годзе пасеўная плошча дасягае 3.810 тыс. га.** Прыкладна па 1.400 тыс. га больш, чым у тыя часы, калі на Беларусі гаспадарамі былі не рабочая кляса, а абшарнікі і капіталісты.

Апрача конскай цягавай сілы, якая прыкладна зьяўляецца стабільнай у параўнаньні з 1916 г., мы за гэты час набылі мэханічную цягу — трактарны парк у 32.800 конскіх сіл.

36 саўгасаў і калгасаў БССР на сёньняшні дзень электрыфікаваны. Пабудаваны і будуецца 91 завод па перапрацаванню апрацоўцы ільну.

Пасеўная плошча бульбы і ільну параўнальна з даваенным часам павялічылася амаль у тры разы. Калі пад ільном у 1916 г. было засеяна 94 тыс. га, у 1924 г. — 88 тыс. га, **дык гэтай вясной пасеўная плошча ільну ўжо дасягае 270 тыс. га.**

У параўнаньні з мінулым годам яра вы плян павялічыўся на 9,7 проц. Па такіх культурах, як бульба мы маем павялічэньне на 63.600 га, па ільне —на 30.400 га.

Пасеўная плошча сацыялістычнага сэктару — саўгасаў і калгасаў — ужо дасягае 60,6 проц. усёй пасеўнай плошчы БССР.

Той факт, што нагрузка на каня ў калгасе вясной складала 4,68 га супроць 2,70 у адноасобным сэктары, паказвае перавагу калектыўнай працы.

57 МТС гэтай вясной засеялі 41 проц. яравога кліну калгасаў. Гэты факт сьведчыць, што мэханізацыя сельскай гаспадаркі ўсё больш укараняецца ў саўгасную і калгасную вытворчасьць.

Гэтыя посьпехі дасягнуты намі ў выніку пасьлядоўнага і няўхільнага правядзеньня генэральнай лініі нашай партыі. У гэтым годзе ўся КП(б)Б, савецкія арганізацыі зьверху да нізу больш канкрэтна, больш апэрацыйна кіравалі веснавой сяўбой. Аб гэтым сьведчыць і той факт, што амаль усе члены ўраду былі ўвесь час на пасеўнай кампаніі і непасрэдна ў вёсны. Мы наглядаем значную актывізацыю раённых і сельскіх зьвешняў савецкага апарату ў бок канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва выкананьнем тых задач, якія перад намі стаяць.

Далей тав. Рачыцкі спыняецца на радзе недахопаў, што мелі месца ў часе веснавой сяўбы. Сюды адносіцца негыстарчальнае скарыстаньне агратэхнікі, сродкаў вытворчасьці, і рад выпадкаў парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці.

У выніку невыстарчальнага скарыстаньня матар'яльнай базы, машын, трактараў і коняй мы мелі ў частцы паўнаў недавыкананьне плянаў, заняжку сяўбы, што бясспрэчна можа адбіцца на ўраджайнасьці.

Як прыклад, тав. Рачыцкі прыводзіць такі факт, што каля 1.000 тон угнаеньня ў нас засталося вясной нескарыстанымі.

Або возьмем такі прыклад, як скарыстаньне МТС. Па грубых падліках прастой трактарнага парку дасягаў 20-25 проц. усяго рабочага часу. Прыкладна 10-15 проц. трактарнага парку было скарыстана на бескарысны прабег з вучастку на вучастак, з вёскі ў вёску.

Пэрыяд рамонту трактарнага парку і падрыхтоўкі кадраў як цэнтральныя, так і раённыя арганізацыі праваронілі. Трактарны парк быў адрамантаваны нядобраякасна. Кадры былі недаволі кваліфікаваныя, каб як належыць кіраваць трактарам і прычэпнымі машынамі. Усё гэта ў выніку прывяло да значнага прастою трактараў і іншых сродкаў вытворчасьці. Конская цяга ня была ў поўнай меры спалучана з цягай трактарнай.

Тав. Рачыцкі прыводзіць рад фактаў адміністраваньня і парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці, якія былі дапушчаны ў паасобных мясцох і адмоўна ўплывалі на ход сяўбы. Напрыклад, у **Старобінскім** раёне 300 гас падарак не атрымалі агародаў. Калі па скарзе гэтых гаспадарак было прапавана аднавіць іх правы на гароды, —дык быў атрыман адказ, што агароды ў 1931 г. перададзены калгасу і зьвернуты быць ня могуць.

Другі факт парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці. **Кучанскаму сельсавету,** Сеньненскага раёну, прапанавана зьвярнуць агароды такім та грамадзянам. Сельсавет адказвае бюракратычнай адпіскай, дырэктыву ня выконвае.

У **Чашніцкім** раёне грамадзянам вёскі **Валынец** далі зямлю для засеву за 12 кілёмэтраў ад сядзібы, у той час, калі была зямля значна бліжэй.

У Дрысенскім раёне пры адводзе сенажаці зямля цэлага калгасу, які яднае 160 гаспадарак, была далучана да саўгасу. З гэтым яшчэ можна было-б мірыцца, калі-б гаспадаркам была дана зямля ў іншым месцы, але зямлю забралі, а ў другім месцы не далі.

Сэсія ЦВК павінна шырока выявіць і абмеркаваць гэтыя факты, абуздаць «спрытных законьнікаў». Трэба нарэшце прымусіць людзей выконваць рэвалюцыйныя законы савецкай улады.

«Сяўбой,—гаворыць т. Рачыцкі, — яшчэ не канчаецца барацьба за ўраджай. Страты, якія мы мелі вясной, трэба навярстаць зараз у час прапалачнай і ўборачнай кампаніі. Шматгадовыя досьледы паказваюць, што непрапалатыя агароды, непрапалаты лён даюць зьніжэньне ўраджаю на 10 проц. Нам трэба прапалоць 269 тыс. га ільну, 100.000 га збожжавых, правесьці двухразовую абсыпку бульбы на плошчы 610 тыс. га, гароду— па 73 тыс. га, коранаплодаў — 24 тыс. га.

Другая задача, якая павінна быць вырашана ў самы кароткі тэрмін, гэта сенаўборка. Мы павінны ўбраць 1.850 тыс. га ад першага ўкосу лугавых і сеяных траў і 425 тыс. га другога ўкосу.

Як поліва, так і сенаўборка ня могуць быць выкананы ў тэрміны, вызначаныя ўрадам, без канкрэтнага пляну, без канкрэтнага кіраўніцтва, бяз уліку асаблівасьцяй асобных раёнаў, асобных гаспадарак.

Для прыкладу возьмем Малакопрамтрэст, які мае 85 гаспадарак і 56 тыс. га першага ўкосу, з якіх 36.700 га ў 11 гаспадарках. Ясна, што гэта абавязвае нас зьвярнуць па гэтым гаспадаркі асаблівую ўвагу. Такое-ж становішча мы маем па лугавому трэсту, дзе ў 13 гаспадарках, ёсьць прыкладна 27 тыс. сенажаці.

Праграма сіласаваньня **ў аб'ёме 1.200 тыс. тон** павінна быць намі ва што-б там ні стала выканана. Ужо зараз трэба ўзяцца за сіласаваньне дзікіх траў і зялёнай масы, якая застанецца пасьля поліва. Мы павінны ва што-б там ні стала стварыць моцную кармовую базу для нашай сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Плян азімага кліну намі вызначан у 1.300 га. Для выкананьня яго нам ўжо зараз трэба было ўзьняць ня менш 300.000 га папару. Весткі з раёнаў і сельсаветаў сьведчаць, што ўздым папару як належыць не разгорнут. Задача сэсіі ўлічыць гэта і прыняць належныя захады ня толькі ў сэнсе вынясеньня аднаведнай пастановы, але і ў сэнсе арганізацыі канкрэтнай работы на месцах.

У гэтым годзе нам трэба ўбраць: **1.260 тыс. га азімых, 1.194 тыс. га яравых збожжавых культур, 600 тыс. га бульбы, 72.000 га гародніны, 259 тыс. га ільну і 24.000 га коранаплодаў.** Усе культуры, за выключэньнем збожжавых, зьяўляюцца прапаёмкімі і патрабуюць шмат людзкой і цягавай сілы. Ні ў якім разе нельга дапускаць такога становішча, якое наглядалася ў мінулым годзе ў паасобных саўгасах і калгасах, калі ад 20 да 30 проц. бульбы засталося ў зямлі.

Тав. Рачыцкі пераходзіць да тэрміну ўборкі. Для ўборкі азімых мы вызначаем 10 дзён. Выходзячы з гэтага трэба складаць апэрацыйныя пляны па раёнах, сельсаветах, саўгасах і калгасах.

На яравых збожжавых культурах апошні тэрмін уборкі вызначаецца 15 верасьня, па бульбе — 1 кастрычніка. Мы мяркуем у 10-дзенны тэрмін перадраць, перабіраваць увесь кліп выбранае бульбы. Па агародах канчатковы тэрмін уборкі —25 кастрычніка, па кармовых коранаплодах — 5 кастрычніка, па ільну — 5 верасьня. Вось тыя тэрміны, якія мы вызначаем для ўборкі яравога і азімага кліну.

Каб выканаць пастаўленую намі задачу, неабходна побач з падрыхтоўкай матар'яльнай базы, правільнай расстаноўкай людзей і машыны, разгарнуць масавую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў. Трэба шырока папулярызаваць выданыя Саюзным ўрадам і ўрадам БССР законы. Трэба папулярызаваць ільготы па с.-г. падатку, пастановы аб зьніжэньні пляну збожжа і мясазагатовак і аб калгасным гандлі. Гэтым мы бязумоўна лаб'ем павялічаньня вытворчых стымулаў сярод шырокіх колаў працоўнага сялянства.

У кожным саўгасе і калгасе трэба арганізаваць работу на аснове замацаваньня вытворчых вучасткаў за брыгадамі шляхам пераключэньня іх з сяўбы на поліва, а потым на ўборку на тых-жа культурах.

Я лічу, што нашы рённыя і сельсавецкія арганізацыі, увесь савецкі актыў, які паказаў сваю здольнасьць змагацца за лінію партыі ў часе веснавой сяўбы, улічыўшы выяўленыя намі недахопы і скажэньні, справяцца і з тымі грандыёзнымі задачамі, якія стаяць перад намі ў часе поліва і ўборкі, мабілізуючы на гэту справу актыўнасьць шырокіх мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДАХ АБ ВЫНІКАХ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ І ЗАДАЧАХ УБОРАЧНАЙ

7 ліпеня на раніцнім і вячэрнім пасяджэньнях III сэсіі ЦВК БССР X скліканьня адбываліся спрэчкі па дакладах Наркамзему, Калгасцэнтру і ўпаўнаважанага Трактарацэнтру. Выступіла каля 35 чалавек.

Аб чым гаварылі дэлегаты? Яны гаварылі аб перамогах, атрыманых на фронце 3-й бальшавіцкай вясны, у жорсткай барацьбе з клясавым ворагам і яго агентурай—правым і «левым» апартуністам. Яны расказвалі пра вопыт работы, які забясьпечвае выкананьне пляну веснавой сяўбы, бязьлітасна крытыкавалі недахопы і тормазы, якія перашкаджалі ў рабоце, і якія трэба ўлічыць з тым, каб у часе прапалачна-ўборачнай іх не паўтарацца.

— У калгасе «Інтэрнацыянал» 53 проц. яўрэйскага насельніцтва, — гаворыць дэлегатка ад **Грозаўскага** сельсавету, Капыльскага раёну, тав. **Шульман.**—Плян веснавой сяўбы мы перавыканалі на 40 проц. 15 та тэхкультур прапалата ў першы раз і 8 та на другому разу.

— Усё гэта нам далося ня лёгка, —гаварыла далей **Шульман.**—Клясавы ворат ужываў усе спосабы, каб скампрамэтаваць інтэрнацыянальны калгас. У самы разгар сяўбы варожыя элементы прабавалі ўнесьці нацыянальную варожасьць у рады калгасьнікаў. Але пад кіраўніцтвам партарганізацыі калгас «Інтэрнацыянал» вышаў пераможцам у веснавой пасеўнай. Ён будзе служыць прыкладам і ў часе ўборкі ўраджаю...

Старшыня **Кіятынскага** сельсавету, Быхаўскага раёну, тав. **Кобрынкаў** расказвае аб тым, што калгасны сэктар выканаў плян сяўбы на 100 проц. і аднаасобны—на 98 3 проц.

— Але я-б хацеў спыніцца на тых агідпасьцях, якія былі праяўлены з боку МТС,—кажа **Кобрынкаў.**—З намі былі заключаны дагаворы на апрацоўку зямлі трактарамі. І калі-б мы спадзяваліся на атрыманьне іх, плян ня быў-бы выканан. Ні аднаго трактара мы не атрымалі. Адсюль і невыкананьне пляну ў вызначаныя тэрміны.

— **Баеўскі** сельсавет, Крычаўскага раёну, скончыў прапалку тэхнічных культур,—гаворыць тав. **Дзядук.** — Праведзена растлумачальная работа ў кожнай калгасным брыгадзе аб значэньні сваячасовай уборкі ўраджаю і барацьбе са стратамі. Правільная расстаноўка сіл, правядзеньне масавай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнага бядняцка-серадняцкага насельніцтва забясьпечыла выкананьне пляну веснавой сяўбы і забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі.

Дэлегат **Старобінскага** сельсавету, таго-ж раёну, тав. **Садоўскі** гаворыць аб тым, што масавая работа ў часе веснавой сяўбы, барацьба за **арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне** калгасаў далі станоўчыя рэзультаты. Значная частка беднякоў і сераднякоў у часе сяўбы ўступіла ў калгасы. Раён калектывізаваны на 82 проц.

— На аснове правядзеньня масавай работы ў калгаснай брыгадзе, **Красьніцкі** сельсавет, Касьцюковіцкага раёну, выканаў плян сяўбы на 105 проц.,—гаворыць тав. **Маскалёў.**

Тав. **Пісараў** (Прапойскі раён) ілюструе фактамі, як на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва, ліквідацыі абязьлічкі і карыстаньні машынамі, збруяй, коньмі калгасы **Кульчыцкага** сельсавету выканалі плян на 105 проц. Сваім прыкладам калгасы ламалі кулацкае супраціўленьне і павялі за сабой аднаасобныя сэктар. Такім чынам плян сяўбы аднаасобнікамі выкананы на 101,3 проц.

На трыбуне дэлегат ад **Грудзінскага латыскага сельсавету** (Быхаўскі раён) тав. **Бруціс.**

— Плян сяўбы мы выканалі,—кажа тав. Бруціс.—Кулакі ўсяляк імкнуліся сарваць пасеўную. Былі моманты, калі асобныя сяляне, пад уплывам кулацкай агітацыі, адмаўляліся сеяць. Але мы гэта сваячасова выкрывалі і на падставе масавай работы сярод насельніцтва мы выйшлі пераможцамі ў часе пасеўнай і падрыхтаваліся ўжо да ўборачнай кампаніі.

Спрэчкі з усёй паўнатой сьведчаць аб тым, што там, дзе разгорнута масавая работа, дзе правільна расстаўлены сілы, за кожнай брыгадай замацаван інвэнтар, коні, там было забясьпечана ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне пляну сяўбы.

Тав. **Стракоўскі** падкрэсьліў тое, што многія раёны недаацэньваюць ролі і значэньня ўліку. Аб гэтым сьведчыць несваячасовае прадстаўленьне вестак аб выніках веснавой сяўбы па некаторых раёнах БССР.

Намесьнік Наркому Земляробства тав. **Масюкоў** сканцэнтраваў увагу сэсіі на пытаньнях сваячасовай уборкі ўраджаю. Ён лічбамі паказваў тыя страты, якія мы нясем пры дрэнным арганізацыі працы ў часе ўборкі збожжавых культур і бульбы.

Прадстаўнік менскага Сьвінаводтрэсту тав. **Туркін** у сваім выступленьні выказаў апартуністычную безнадзейнасьць сваячасовай уборкі. Касаркі ёсьць, жнівяркі ёсьць і конныя граблі ёсьць, а рабочых не хапае 60 проц...»

На каго скардзіцца менскі сьвінаводтрэст у асобе свайго прадстаўніка — невядома. Ці ня лепш было-б, калі-б сьвінаводтрэст перабудаваў сваю работу і пачаў-бы кіраваць сваёй сыстэмай на аснове **6-ці ўказаньняў тав. Сталіна?** Крытыка рэч добрая, але яна лепш, калі спалучаецца з самакрытыкай. На жаль гэтага ня было ў выступленьнях т. т. Стракоўскага, Масюкова і іншых прадстаўнікоў ад ведамасьных устаноў. Пацыярджэньнем гэтаму зьяўляецца наступнае выступленьне.

— Наркамзем Беларусі разьвіў формы вытворчых пляцаў — расказвае старшыня Сіроцінскага РВК тав. **Ражноўскі.** — Для таго, каб іх разабраць, трэба патраціць вельмі шмат часу. Гэтыя формы нашы аграномы разьбіралі на працягу тыдню.

— У апаратах Наркамзему, Калгасцэнтру, Трактарацэнтру і інш. Часам ня ведаюць, што робіцца ў раёнах,—гаворыць старшыня Крычаўскага РВК тав. **Семашка.** — Пляц раён назвалі жывёлагадоўча-бульбяным, а лён і канопліі займаюць 10 проц. плошчы. У часе пасеўнай, 6 трактараў стаялі без плугоў. Ведаў аб гэтым упаўнаважаны Трактарацэнтру? Не, ня ведаў.

Дэлегаты многа спыняліся на прычынах адставаньня МТС у пачатку сяўбы. Гэтыя прычыны зводзіліся да таго, што МТС несваячасова падрыхтавалі да сяўбы трактарны парк, не клапаціліся яшчэ ў пачатку лімы аб падрыхтоўцы кваліфікаваных трактарыстаў.

Многа дэлегатаў у сваіх выступленьнях гаварылі аб апартуністычнай недаацэнцы сіласаваньня кармоў. Спадзяючыся на добрых ўраджай траў, большасьць раёнаў да гэтага часу не прыступае да такога ям і траншэй.

***

8 ліпеня па раніцнім пасяджэньні ў спрэчках выступіла 6 дэлегатаў. Сэсія заслухала заключнае слова тав. **Рачыцкага**

Інж. Скрыган

Лесахэмію—на вышэйшую ступень!

(Да ўсебеларускай нарады па хэмізацыі народнай гаспадаркі)

У сваёй пастанове аб асноўных устаноўках да складаньня пляну другой пяцігодкі, ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапанавалі забясьпечыць максымальнае разгортваньне лесахэміі на базе комплекснага скарыстаньня значных сырцовых рэсурсаў БССР (каніфольна і мыльна-экстрактныя заводы).

Выканаць гэтую дырэктыву можна толькі шляхам камбінаваньня розных вытворчасьцяй на мэханічнай і хэмічнай пераапрацоўцы лесахэматар'ялаў і поўнага скарыстаньня тых адыходаў, якія атрымліваюцца пасьля мэханічнай пераапрацоўкі.

Лесахэмія набывае вельмі вялікае значэньне ў разьвіцьці лясной гаспадаркі, яна дае магчымасьць поўнасьцю скарыстаць лесасырэц і ліквідаваць самае разуменьне «адыходаў» у дрэваапрацоўчай і лясной прамысловасьці.

Гідраліз адыходаў дае рад высокакаштоўных хэмічных прадуктаў. Паводле данных за 1931 год, лесапільныя заводы БССР пераапрацавалі 2 мільёны кбм. драўніны, што дае, калі лічыць сярэдні адыход у 40 проц. — 800 тыс. кбм. адкідаў, з іх 240 тыс. кбм. шлавіньня—матар'ялу, для гідролізу, які не патрабуе далейшай мэханічнай пераапрацоўкі.

У плянах другой пяцігодкі лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці прадугледжана будаўніцтва заводаў па выпрацоўцы кармовага цукру на базе адкідаў Бабруйскіх і Віцебскіх лесапільных заводаў. Больш мэтазгодна здабываць з адкідаў іншыя хэмічныя прадукты, бо выпрацоўка чыстага кармовага прадукту зьвязана з труднасьцямі і значным расходам кіслаты. У нас добра разьвіваюцца коранаплоды і іншыя кармовыя культуры. Іх можна скарыстаць для кармленьня жывёлы, а з адкідаў трэба здабываць віннаэцілавы сьпірт і інш. хэмікаты. Уцілізацыя вышэйпаказанай колькасьці адкідаў можа даць краіне 50 мільёнаў літраў стопроцантнага сьпірту, 10 тыс. тон фурфуролу 7 тысяч тон вопатнай кіслаты, 90 тыс. тон лігніну, які пакуль-што ідзе на апал заводзкія топкі і дзесяткі тон кармовых прадуктаў.

У Саюзе толькі 7,2 проц. **сьпірту** выдаткоўваецца для тэхнічных патрэб, у той час, як, напрыклад, ужываньне сьпірту, як вадкага апалу для рухавікоў унутранага згараньня мае вялікае практычнае значэньне. Досьледы раду інстытутаў даказалі перавагу гэтага віду апалу перад іншымі прадуктамі, што атрымліваюцца з нафты. Ужываньне сьпірту для тэхнічных мэтаў значна скароціць колькасьць прывознага бензіну. Стапоўча вырашана таксама праблема атрыманьня са сьпірту сынтэтычнага каўчуку. Наогул, сьпірт зьяўляецца універсальным сырцом для хэмічнай прамысловасьці, ён знайшоў ужываньне ў 150 галінах прамысловасьці.

Атрыманьне з драўніны такога каштоўнага прадукту як **фурфурол** (шляхам гідразіву адной з частак драўніны—пэнтазанаў, якіх ёсьць 12 проц. у хвойнай драўніне, і 22-23 проц. у лісьцёвай), дае магчымасьць разьвіцьці у БССР рад вытворчасьцяй. Досьледы гавораць аб тым, што фурфурол можа з посьпехам замяніць дарагі і часткова імпартны прадукт — **форма-альдэгіт.**

Фурфурол ужываецца ў розных галінах прамысловасьці: для атрыманьня штучнай смалы і плястычных мас, для здабываньня фарбы, для вырабу алірыны, ужываецца як ускарыцель пры вулканізацыі каўчуку, як дубіцель у гарбарнай вытворчасьці, для кансэрваваньня дрэва, для наданьня паху тытуню, для пратручваньня насеньня, збожжа і буракоў і інш.

Фурфурол мае вялікія пэрспэктывы і ў недалёкай будучыне зойме ганаровае месца ў хэмічнай прамысловасьці, выціснуўшы іншыя хэмічныя прадукты.

На выраб віннага сьпірту, фурфуролу і воцату трэба скарыстаць 65-70 проц. драўніны, рэшта — 35-30 проц. — так зв. **лігнін** пойдзе на апал, у выглядзе брыкетаў. Цеплатворная здольнасьці брыкетаванага лігніну вельмі вялікія — каля 5 тысяч калёрый. Для парасілавай гаспадаркі дрэваапрацоўчых заводаў лігнінны брыкет — значна больш выгодны від апалу, чым сырыя адкіды. У будучым пры правядзеньні належнай дасьледчай працы можна будзе ажыцьвіць здабываньне з лігніну будаўнічых матар'ялаў.

На базе хэмсэктару беларускага НДІ лясной прамысловасьці трэба арганізаваць навукова-дасьледчы лесахэмічны інстытут, дзе будуць аб'яднаны ўсе віды хэмічнай апрацоўкі драўніны — вытворчасьць цэлюлёзы, паперы, каніфолі, гідролі, сухая перагонка і інш.

Разьвіцьцё хэмічнай прамысловасьці ў СССР зусім апраўдвае словы Карла Маркса аб тым, што па меры аўладаньня чалавецтвам хэмічнымі мэтадамі і рэакцыямі, мэханічная апрацоўка будзе ўступаць месца хэмічнай ўзьдзейнасьці.

ЧАМУ ДРЭННА ПРАЦУЕ БАБРУЙСКІ ФАНЭРНЫ ЗАВОД

Фанэрны завод № 16 (Бабруйск) зьяўляецца адным з буйнейшых фанэрных заводаў БССР. Завод абсталяваны паводле апошняга слову тэхнікі. Ён мае тры клеельныя і тры сушыльныя прэсы. За перше паўгодзьдзе завод павінен быў выпусьціць 18.950 кв. мэтраў альховай і 1.800 тыс. дубовай нажавой фанэры.

Заводзкія арганізацыі перабудовай вытворчай работы павінны былі забясьпечыць выкананьне гэтай адказнай задачы. Аднак, яны ня справіліся са сваімі абавязкамі. За першы квартал завод выканаў прамфінплян па альховай фанэры толькі на 75 проц., за красавік — на 89 проц., май —99 проц., чэрвень — 80 проц. Яшчэ горш стаіць справа з выкананьнем пляну па нажавой фанэры, якая зьяўляецца больш рэнтабельнай за другія віды фанэры. За першы квартал плян выканан на 62 проц., за красавік—на 91 проц., май—108% і чэрвень — на 75 проц.

Аспоўкай прычынай ганебных паказальнікаў зьяўляецца тое, што ні трыкутнік у цэлым, ні паасобныя яго зьвеньні ў паасобку не ўзяліся па-сапраўднаму за рэалізацыю шасьці ўмоў тав. **Сталіна.** Зусім не праводзіцца барацьба за гаспадарчы разрахунак. У выніку адсутнасьці кіраўніцтва раз валілася 48 гаспадарча-разрахунковых брыгад, якія раней працавалі на заводзе.

На заводзе працуе больш 1.200 рабочых, а інтэрнатаў ёсьць толькі на 80 чалавек. У цэхах стаіць толькі адзін бак з вадой. Сталовая малая, брудная, не хапае прыбораў. Для таго, каб паабедаць трэба патраціць шмат часу. Нездавальняючыя бытавы ўмовы сказаліся на рабочай сілы. За першае паўгодзьдзе прынята на завод 731 чалавек, а выбыла 900 чалавек.

Ня гледзячы на тое, што завод аддзяліўся ад камбінату больш 3-х месяцаў назад, да апошняга часу пастаноўка працы на заводзе нагадвае сабой арганізацыйны пэрыяд. Сакратар парткалектыву тав. Канчакоў гаворыць: «мы яшчэ перабудоўваемся».

Так далей заводу працаваць нельга. Апартуністычныя адносіны да выкананьня шасьці ўмоў тав. Сталіна павінны быць ліквідаваны. Н.

Броўкін Т., Лейтэс С., Фарбэр Б.

ПАСТАЯННАЯ КАЛГАСНАЯ БРЫГАДА ВЫРАШАЕ ПОСЬПЕХІ ЎБОРАЧНАЙ

На аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, партыя набілася вялізарных посьпехаў на фронце трэцяй бальшавіцкай сяўбы. Савецкі саюз канчаткова зацьвердзіўся на новым сацыялістычным шляху. Дальнейшае змаганьне за высокі ўраджай, за сваячасовае правядзеньне поліва, сенаўборкі і ўборкі збожжавых культур залежыць ад плянамернай і рацыянальнай арганізацыі працы, ад правільнай расстаноўкі рабочай сілы ў калгасах і пастаянных вытворчых брыгадах.

Іменна толькі правільна пабудаваная **пастаянная вытворчая брыгада вырашыць посьпехі ўборачнай.** У пастанове ЦК УсесКП(б) ад 4 лютага ясна сказана: «Важнейшым зьвяном у арганізацыі працы ў калгасах павінна стаць **брыгада.** У адноаведнасьці з вопытам лепшых с.-г. арцеляй, ЦК лічыць мэтазгоднай арганізацыю ў калгасах брыгад з пастаянным складам калгасьнікаў, з тым, каб, як правіла, такія брыгады рабілі ўсе асноўныя сельска-гаспадарчыя работы на працягу ўсяго году на поўных вучастках. Этым брыгадам калгас вылучае на час работы неабходныя машыны, інвэнтар і рабочую жывёлу, за стан якіх калкам адказвае брыгада».

Толькі на аснове ўказаньняў ЦК УсесКП(б), пры замацаваньні вытворчых вучасткаў за пастаяннымі брыгадамі ствараюцца ўсе магчымасьці рацыянальна скарыстаць рабочую сілу, падняць прадукцыйнасьць працы на вышэйшую ступень.

Перад кожным калгасам перш-наперш паўстае задача ліквідаваць абязьлічку палёў, зьнішчыць цякучасьць рабочай сілы, устанавіць пэрсанальную адказнасьць за правільнае і эфэктыўнае скарыстаньне сродкаў вытворчасьці: каня, транспарту, с.-г. машын, збрую і інш.

Выходзячы з устаноўленага севазвароту патрэбна ў кожным калгасе правільна арганізаваць вытворчыя палявыя вучасткі, у якія-б уваходзіла поўная колькасьць культур. Замацаваць вучасткі за брыгадай, устанавіць, як правіла, што ад посьпехаў работы, ад узьнікненьня ўраджайнасьці залежыць ацэнка працадня ўдзельнікаў брыгады.

Аднак, вопыт арганізацыі брыгад у часе веснавой пасеўнай кампаніі паказаў, што некаторыя калгасы паўтараюць памылкі мінулага году.

Калгас імя **Дзяржынскага,** Рэчыцкага раёну, арганізаваў брыгады ня па вытворчай, а па тэрытарыяльнай аднаце. У кожным населішчы арганізавана свая брыгада. Кожная брыгадзе вылучаны ўсе культуры, якія пасеяны ў калгасе. Пры такой арганізацыі брыгад нельга ліквідаваць цякучасьць рабочай сілы, ліквідаваць абязьлічку, эфэктыўна скарыстаць сродкі вытворчасьці. Па сутнасьці мы тут маем брыгады-дворкі з поўным захаваньнем ураўнілаўкі, дробна-буржуазных навыкаў, прынцыпаў дробнай улас най гаспадаркі.

Калгас **«Чырвоная Беларусь»,** Аршанскага раёну, зрабіў зусім адваротнае. Арганізаваў вузка-спэцыялізаваныя брыгады. Напрыклад, адна брыгада павінна пасеяць і ўбраць 49 га бульбы і 85 га жыта, другая — 55 га бульбы, 64 га сенажаці, трэцяя — 62 га аўса і 10 га коранаплодаў і г. д. Пры такой вузкай спэцыялізацыі, пры вылучэньні аднэй-двух культур, брыгады ў асобныя месяцы зусім не нагружаны работай і наадварот, у некаторыя месяцы ім патрэбна рабочай сілы ў 2-2 з пал. разы больш, чым ёсьць.

Такім чынам як у першым, так і ў другім прыкладзе замест ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі, правільнай, роўнамернай расстаноўкі рабочай сілы, фактычна ўзаконьваюцца ўсе адмоўныя бакі, якія зусім ня спрыяюць, а толькі перашкаджаюць арганізацыі калгасной вытворчасьці.

Трэба неадкладна выправіць памылкі, якія дапушчаны асобнымі калгасамі, трэба з усёй рашучасьцю змагацца са скажэньнямі аспоўных прынцыпаў пастаянных брыгад, са спробамі арганізацыі брыгад-дворак, вузка спэцыялізаваных брыгад і г. д.

Асабліва важным пытаньнем у пасьпяховай рабоце пастаянных вытворчых брыгад зьяўляецца сваячасовае і правільнае іх пераключэньне па поліва, сенаўборку і ўборку тэхнічных культур. Між тым, мы наглядаем, што ў большасьці калгасаў брыгады атрымалі вытворчыя заданьні толькі на часы сяўбы. Як працавалі, як расставіць сілы ў часе поліва, сенаўборкі брыгады ня ведаюць.

Задача павышэньня ўраджайнасьці, зьнішчэньня страт у сельска-гаспадарчай вытворчасьці вымагае суровага захаваньня тэрмінаў пасеву, праполкі, уборкі, правядзеньня ўсіх агратэхнічных мерапрыемстваў. Тому **пры пераключэньні брыгад з веснавой сяўбы на прапалачную і ўборачную кампаніі, расстаноўка рабочай сілы ў брыгадзе набывае рашаючае значэньне.**

Для выкананьня пастаўленых задач, брыгады павінны разьбівацца на групы, а групы, калі гэта патрэбна, паасобныя зьвеньні. Склад груп вызначаецца ў залежнасьці ад тэхнічнай узброенасьці і вытворчага заданьня, якое атрымала брыгада. Прычым, вельмі важна, каб аснову касьцік груп пры пераключэньні з сяўбы на поліва, з поліва на ўборку — захаваўся. Толькі пры захаваньні аснову касьцяка, групы могуць дысцыплінавацца, даць вышэйшую прадукцыйнасьць працы.

На прыкладах некаторых калгасаў, мы хочам паказаць, як трэба пераключаць брыгады па поліва і ўборку.

Возьмем жывёлагадоўча-бульбяны калгас «Случ № 2», Слуцкага раёну. У калгасе ёсьць 3 паляводчыя брыгады. Кожная брыгада трымала ня больш 6-8 культур. Вытворчыя вучасткі першай брыгады знаходзяцца ў адным масыве, другой і трэцяй брыгады — у двух сумежных масывах. Плянавае размяркаваньне культур па брыгадах забясьпечвае кожную брыгаду вядучай працаёмкай культурай — бульбай. Гэта ў сваю чаргу спрыяе зрэзваньню «пік» напружанасьці ў паасобных сельгаспрацы.

Для выкананьня ўсіх работ на вытворчым вучастку, які замацован за брыгадай № 1, патрэбна рабочай сілы ў часе веснавой сяўбы — 29 чал. і ў самы напружаны момант у часе ўборкі бульбы — 48 чал. Выходзячы з гэтага, праўленьне калгасу вызначыла пастаянны склад брыгады № 1 у 35 чал. Такі склад брыгады выконвае ўсе работы на сваім вучастку на працягу ўсяго году. Устаноўленая колькасьць калгасьнікаў у брыгадзе ў 35 чал. дае магчымасьць зьнішчыць цякучасьць у брыгадзе, да мінімум зьвесьці перакідкі калгасьнікаў з аднэй брыгады ў другую.

З посьпехам правёўшы веснавую сяўбу, брыгада № 1 зараз пераключылася на поліва, сенаўборку і падрыхтоўку да ўборкі збожжавых.

Калгасьнікі паставілі сваёй мэтай дасягнуць максымальнай прадукцыйнасьці працы. Для гэтага брыгада разьбіта на дзьве групы. Скончыўшы (27 мая) сяўбу, групы пераключыліся на поліва. Брыгадзір загадзя распрацаваў каляндарны плян работ кожнай групе, нават паасобным зьвеньням вызначыў тэрміны выкананьня вытворчага заданьня, вызначыў нормы выпрацоўкі і г. д. Ні адзін чалавек у брыгадзе дарэмна ня блукаецца. Кожны ведае сваё месца, сваё заданьне.

Пры ўмелым кіраўніцтве брыгадзіра, пры ўмелай расстаноўцы сіл брыгада сваячасова скончыць поліва, сенаўборку, сваячасова пераключыцца па ўборку збожжавых, а потым бульбы, выканае сваё вытворчае заданьне ў вызначаны ўрадам тэрмін.

Ільнаводчы калгас **«Барацьба»,** Шклоўскага раёну, мае 2.846 га пахаці. Калгас засеў і павінен убраць апрача збожжавых 700 га ільну, 390 га коранаплодаў, 325 га кармовых траў, 371 га сенажаці і 30 га сіласных культур. Калгас абслугоўваецца машынна-трактарнай станцыяй.

МТС у калгасе арганізавала 10 вытворчых паляводчых вучасткаў, стварыла 10 паляводчых пастаянных брыгад. Кожнай брыгадзе вызначана аднаведная колькасьць гектараў вядучай культуры — ільну.

Брыгада № 8 калгасу «Барацьба» атрымала вытворчае заданьне—убраць жыта — 54 га, ільну — 63 га, ячменю — 28 га, бульбы — 30 га, вікі — 50 га, сенажаці — 27 га, капюшыны — 14,5 га. Склад брыгады — 36 чалавек.

Заданьне не маленькае. Адсюль і задача перад брыгадай вельмі адказная. Пачынаючы з 3 чэрвеня, брыгадзір адразу пераключыў адну групу брыгады ў колькасьці 28 чалавек на поліва 40 гэкт. раньняга пасеву ільну. Другая група ў колькасьці 8 чал. працягвала сяўбу позьніх яравых. Скончыўшы да 20 чэрвеня поліва ільну ня толькі рань няга, але

Дзевяць год канстытуцыі СССР

На ўрачыстым пленуме Менскага гарсавету

Адбылося ўрачыстае пасяджэньне пленуму Менскага гарсавету з удзелам прадстаўнікоў партыйных, прафэсыянальных арганізацый, Чырвонай арміі, рабочых фабрык і заводаў, прысьвечанае дзевяцігодзьдзю канстытуцыі СССР.

6 га ліпеня—дзень зацьвярджэньня канстытуцыі СССР—гістарычная дата ў жыцьці ня толькі народаў Саюзу, але і працоўных усяго сьвету.

«Толькі ўлада Саветаў, толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, згрупаваўшай вакол сябе большасьць насельніцтва, аказалася магчымым выпітчыць у корані нацыянальны ўціск, стварыць абстаноўку ўзаемнага давер'я і закласьці асновы брацкага супрацоўніцтва народаў» (з дэкларацыі аб стварэньні Саюзу ССР).

Старшыня ЦВК СССР і БССР тав. **Чарвякоў** у сваім двухгадзінным дакладзе падагуліў выпікі барацьбы працоўных усіх нацыянальнасьцяй Савецкага Саюзу за перамогу сацыялізму.

Мы атрымалі рашаючую перамогу таму, што цьвёрда праводзілі ў жыцьцё генэральную лінію партыі пад кіраўніцтвам яе ленінскага ЦК. Рабочая клясa Саюзу аддана змагаецца за вырашэньне сур'ёзнай і адказнай задачы «дагнаць і перагнаць» у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны. У гэтай галіне ўжо дасягнуты сусьветна-гістарычныя перамогі.

Асабліва падрабязна дакладчык спыніўся на посьпехах гаспадарчага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР за мінулыя гады, атрыманых дзякуючы дапамозе з боку Савецкага Саюзу.

Посьпехі Савецкай Беларусі служаць найяскравейшым прыкладам вялікага значэньня ленінскага вырашэньня нацыянальнага пытаньня, якое ажыцьцяўляецца ў жорсткай барацьбе супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі ў нацыятыньні, супроць мясцовых шавінізмаў.

Вельмі значнае месца займае таксама Савецкая Беларусь у барацьбе за эканамічную незалежнасьць Савецкага Саюзу.

Усебеларускі зьлёт дэпутацкіх груп мэталязаводаў паказаў, што амаль на кожным заводзе, на кожнай фабрыцы б'ецца рабочая думка, накіраваная на вызваленьне СССР у тэхніка-эканамічных адносінах ад капіталістычнага сьвету.

Асноўным паказальнікам нашых посьпехаў зьяўляецца тое, што мы завяршылі пяцігодку ў чатыры гады.

Прыводзячы рад цікавых даных па вырабе чыгуну, сталі, нафты, вугалю ў СССР і перадавых капіталістычных краінах, тав. **Чарвякоў** адзначае, што ў краінах капіталу—жорсткі эканамічны крызіс, катастрафічнае падзеньне вытворчасьці, масавае закрыцьцё фабрык і заводаў, беспрацоўе і надзвычайнае зьбяднеьне шматмільённых мас вёскі.

«...Ленінізм перамагае. На аснове ленінізму ідзе згуртаваньне радоў рабочай клясы, а вакол яе ўсёй масы працоўных гораду і вёскі. У гэтым «сакрэт» перамог сацыялізму» (Молатаў).

Савецкі Саюз канчаткова ўмацаваўся на сацыялістычным шляху. Ідзе пасьпяховае змаганьне за выкананьне задач чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Посьпехі барацьбы за завяршэньне першай пяцігодкі і выкананьне задач другой патрабуюць перабудовы ўсёй нашай работы па-новаму, канкрэтнасьці і апэрацыйнасьці ў кіраўніцтве, поўнага ўкаранеьня шасьці ўмоў тав. **Сталіна** ва ўсе галіны работы.

На прамысловасьці гэта задача заключаецца ў далейшай барацьбе за прамфінплян, за тэхніка-эканамічную незалежнасьць СССР, за якасьць. Паасобныя галіны прамысловасьці БССР ня выканалі ў першым паўгодзьдзі свайго прамфінпляну. Гэты прарыў павінен быць ліквідаваны, каб забясьпечыць выкананьне пляну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, узмацненьне кіруючай ролі саўгасаў і МТС, пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі — вось асноўныя чарговыя задачы ў галіне сельскай гаспадаркі.

Тав. Чарвякоў асабліва падрабязна спыніўся на пытаньнях дабрабыту гораду і вёскі, калгасным гандлі і капэрацыі, пашырэньні вытворчасьці прадметаў шырокага спажываньня і рэвалюцыйнай законнасьці.

Закранаючы пытаньні аб міжнародным становішчы, дакладчык падкрэсьліў асаблівую ролю БССР, як фарпосту Саюзу і завастрыў увагу на ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны.

Робячы агульны вывад, дакладчык даводзіць, што сьвята 1Х-й гадавіны канстытуцыі Саюзу ССР зьяўляецца сьвятам перамог ленінскай нацыянальнай палітыкі, якая ажыцьцяўляецца пад кіраўніцтвам кампартыі, яе ленінскага ЦК і правадыра партыі тав. Сталіна.

Канстытуцыя Саюзу ССР аформіла такія падставы аб'яднаньня працоўных, якія зьяўляюцца вернай гарантыяй перамог сацыялізму.

Стварэньне Савецкага Саюзу спрыяла магутнаму разьвіцьцю сацыялістычнага будаўніцтва Савецкага Саюзу і саюзных рэспублік.

***

З прывітаньнем з поваду 1Х-й гадавіны канстытуцыі СССР выступілі ад заводу «**Камунар**» тав. **Гольман** і ад чырвонасьцяжнай гарбарні «**Бальшавік**»—тав. **Азарыцкі**.

Пленум паслаў прывітальныя тэлеграмы **ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, ЦВК СССР і ЦВК БССР.**

Узьняць ініцыятыву месц у вырабе прадметаў шырокага спажываньня

Сыстэма Дзяржбанку зараз уключылася ў барацьбу за разгортваньне вырабу прадметаў шырокага спажываньня. На гэту вытворчасьць ужо асігнавана 1.374 тыс. руб. Даведзена да філіялаў для выдачы арганізацыям і прадпрыемствам 1.217 тыс. руб.

Вось некалькі прыкладаў таго, на якія мэты ідуць адпушчаныя крэдыты.

Віцебскай мэблевай фабрыцы адпушчана 80 тыс. руб. на набыцьцё дадатковага абсталяваньня; Чашніцкай прамысловай каапэрацыі — 29 тыс. руб. на дадатковую закупку сырцу для вырабу каламазі, сталярных прыладаў, арганізацыю трусатнікаў і інш.; 40 тыс. руб. асігнавана Менскай галянтарэйнай фабрыцы «Беларуска» на дадатковае набыцьцё сырцу; Белселькаапаб'яднаньню выдана 100 тыс. руб. на варку яблачнага павідла ў глыбінных пунктах.

Паводле даных Дзяржбанку, на мясцох разгортваецца ініцыятыва і выяўляюцца значныя магчымасьці вырабу таваараў шырокага спажываньня розна га роду. Высоўваюцца сустрэчныя планы, падшукваецца абсталяваньне, купляецца сырэц, выяўляецца патрэбная рабочая сіла.

Прамкаапэрацыя г. **Вершы** высунула сустрэчны плян у 333 тыс. руб. на 4 месяцы, замест заданьня 275 тыс. руб. на 7 месяцаў. Выкананьне дадатковай праграмы забясьпечана мясцовым сырцом і адкідамі.

Прамысловыя арцелі мяркуюць выпусьціць 200 тыс. пар абутку з сурагатаў, рымарных вырабаў на 40 тыс. руб., коўдраў на 50 тыс. руб., мэблі на 10 тыс. руб. і інш.

У **Барысаве** намечана вытворчасьць з адкідаў скаварод, вілак, вёдраў, карытаў, а таксама гапчарнага начыньня з мясцовага сырцу. У **Чашніках** пры дапамозе адпушчанага банкам крэдыту ў 24 тыс. руб. арганізуецца сталярная вытворчасьць, выраб каламазі з сушанай гародніны.

У **Горках** кавальская арцель выпусьціла ўжо па 4.000 руб. вілак, прабояў і іншых жалезных вырабаў.

У **Рэчыцы** пры дапамозе крэдыту Дзяржбанку прамкаапэрацыя выпускае звыш пляну гамакоў на 270 тыс. руб.

У **Бабруйску** прамкаапэрацыя высунула сустрэчную праграму ў 261 тыс. руб. замест 187 тыс. Разгортваецца вытворчасьць мэблі, сітаў, рэшатаў, дуг, бандарных вырабаў, лыжак. Бабруйскі мэталязавод імя Варашылава прыняў дадатковую праграму ў 110 тыс. руб. па выпрацоўцы дзьвярных завесаў, скаварод, вёдраў. Банк адпускае заводу крэдыт на дадатковае абсталяваньне ў суме 25 тыс. руб. Лесакамбінат прыступае да абсталяваньня ўцільцэху ў мэтах скарыстаньня адкідаў з праграмай у 229 тыс. руб.

У **Ельску** Леспрэўхэмсаюз павялічыў сваю праграму на 12,5 тыс. руб для выпуску сітаў, рэшатаў, карытаў, вёдраў, для вырабу дзёгцю, каламазі, смалы і інш.

Гомельская прамкаапэрацыя намецціла выпусьціць у гэтым годзе дадатковa вёдраў, лахапак, самаварных труб, чайнікаў і каструль на 100 тыс. руб.

Менскае аддзяленьне Дзяржбанку дагаварылася з абутковай фабрыкай аб крэдытаваньні дадатковай вытворчасьці 10-15 тыс. пар абутку з адкідаў, для чаго пакінута ў часе водпуску 100 рабочых. Атрымаў крэдыт завод імя Молатава у разьмеры 48 тыс. руб. на абсталяваньне ўцільцэху для выпрацоўкі мэблі з адкідаў.

Аднак, ня гледзячы на наяўнасьць значных магчымасьцяй, вытворчасьць прадметаў шырокага спажываньня разгортваецца вельмі павольна. Надзвычай шмат увагі займае ў гаспадарчых органах падрыхтоўчая работа — намячэньне аб'ектаў, разгляд пляпаў, набыцьцё дадатковага абсталяваньня, падшуканьне сырцу, рэгуляваньне пытаньня аб рабочай сіле.

Найбольш слабым вучасткам зьяўляецца прамкаапэрацыя, удзельная вага якой складае 50 проц. праграмы. З Плешчаніц паведамляюць, што калі райпрамсаюз па тэлефону запытаўся ў Белпрамсаюзе пакоўт указаньняў па вырабе і рэалізацыі на рынку прадметаў шырокага спажываньня, ён атрымаў адказ: «прыедзе прадстаўнік і дасьць указаньні». Пакуль што райпрамсаюз ня можа ўстанавіць цэн на выпушчаны з адкідаў тавар. Сапежная арцель атрымала расцэнкі на балеткі, выходзячы з ўмоў мэханічнай вытворчасьці, у сувязі з гэтым члены арцелі, якія працуюць уручную, адмаўляюцца ад работы і выраб зьнізіўся на 25 проц.

У Ельску крэдыт, выданы прамкаапэрацыі на арганізацыю дадатковага вырабу прадметаў шырокага спажываньня ў суме 8.5 тыс. руб., выдаткаваны не па арганізацыю вытворчасьці, а на пабудову і абсталяваньне ўласных крам. На заводах «Камунар» і імя Варашылава ляжаць бяз руху тавары шырокага спажываньня на 12 тыс. руб. з-за адсутнасьці расцэнак і дагавору з Белкаапсаюзам пакоўт рэалізацыі.

Гэтыя непаладкі і коснасьць у вырабе прадметаў шырокага спажываньня павінны быць неадкладна ліквідаваны.

Поўнасьцю скарыстаць адпушчаныя крэдыты, фарсаваць рэалізацыю вырабленых тавараў, — задача ўсіх арганізацый прамысловасьці і прамкаапэрацыі.

С. Палтэўскі.

Беразьнікоўскі хімічны камбінат. Адсюль будуць накіроўвацца на сацыялістычныя палі мінэральныя ўгнаеньні.

Калгас „Гудок“ бяз руля

(Ліст калгасьніка)

Калгас «**Гудок**», **Смалявіцкага** раёну, выканаў плян сяўбы толькі на **44 проц.** Бульбы засеяна **33 га**, замест **150**, ільну засеяна **14**, замест **56** паводле пляну, лубіну—**1½ га**, замест **29** паводле пляну.

Прычыны невыкананьня пляну веснавой сяўбы заключаюцца ў тым, што з боку праўленьня ня была забясьпечана правільная **арганізацыя працы** і кіраўніцтва веснавой пасеўнай кампаніяй. Праўленьне калгасу ня мае добрага кіраўніка. Старшыня калгасу **Ліхтаровіч** не спраўляецца са сваімі абавязкамі і ня здолен кіраваць. Раней старшынёй калгасу працаваў **Караневіч**. Але ў самы разгар сяўбы Караневіч самавольна кінуў калгас і перайшоў на працу ў **МТС**. Караневіч давёў да таго, што калгас разбазарыў насенны авёс, што зьявілася прычынай недавыкананьня пасеву аўса ў ліку 60 га. **За Караневічам** лічыцца яшчэ рад **злоўжываньняў. Але замест прыцягненьня яго да адказнасьці раённыя арганізацыі прынялі яго на вышэйшую работу.**

Цяперашняе праўленьне калгасу на чале з **Ліхтаровічам** яшчэ раз даказала сваю пяздольнасьць кіраваць калгасам. **З 14 га ільну на 6 ліпеня пра полата толькі 0,72 га.** Рэшітка пасеву стаіць зарослы травой. Праўленьне спасылаецца на недахват рабочай сілы. **Але гэта хлусьня.** У калгасе ёсьць 42 працаздольныя жанчыны, якія зараз **няпоўнасьцю нагружаны** працай. Скарыстаньне гэтай рабочай сілы дала-б магчымасьць своячасова і поўнасьцю скончыць плян праполачнай кампаніі. Але ўся бяда ў тым, што праўленьне калгасу **ня здольна** мабілізаваць патрэбную рабочую сілу для выкананьня такой важнай работы, як праполка ільну.

Вучастковы атраном **Барушка** займаецца толькі тым, што езьдзіць з калгасу ў калгас і **зьбірае весткі** аб праробленай працы. Яму зусім няма справы да таго, што ў шмат якіх калгасах па прыкладзе «Гудка» заняваецца выкананьне пляну праполачных работ.

Смалявіцкая МТС, якая абслугоўвае калгас «Гудок», павінна дапамагчы яму вылезьці з прарыву, дапамагчы добра падрыхтавацца да правядзеньня ўборачнай кампаніі.

Вяршына.

БЮРАКРАТА БАЦЬВІНІКА ПРЫЗВАЦЬ ДА ПАРАДКУ

(*Ліст рабочага*)

Па Савецкай вуліцы № 127 ёсьць крама № 7. У гэтай краме працуе **Бацьвінік**, які прымацоўвае на атрыманьне хлеба. Ён асабліва не сьпяшаецца працаваць і ня раіць другім:

— Сьпяшацца няма чаго і няма куды. Пасьпееце,—такімі адказамі частуе **Бацьвінік** рабочых.

З прычыны такіх адносін Бацьвініка шмат якія рабочыя засталіся не прымацаванымі да крамы і ня могуць атрымаць прадуктаў.

Рабочы Матусэвіч разам са сваёй сям'ёй быў прымацаваны да крамы № 7 на працягу доўгага часу, а зараз з прычыны няўважлівых, **бюракратычных адносін Бацьвініка да працы**, ён застаўся **непрымацаваным.**

Адпаведныя арганізацыі павінны ўжыць канкрэтныя захады спагнаньня ў адносінах да бюракрата Бацьвініка.

Рабочы.

Установа пад... дажджом

(*Ліст служачага*)

У маі г.г. Менбуд прыступіў да пад будовы другога паверху на доме Кіраўніцтва Народнага Гаспадарчага Уліку. **Прараб Менбуду Гінзбург** аддаў распараджэньне **зьняць дах з дому. Зьнялі. Стаіць дом без даху тыдзень** —два, а работы ніякай не ідзецца. Калі адпойчы пайшоў дождж, ён заліў усё памяшканьне, у якім працавалі работнікі памяшканьня установы.

Пасьля кожнага дажджу ўсе пакоі **заліваюцца вадой.** Ясна, што ў гэтыя дні спыняецца ўсякая работа ва ўстанове, падрываецца справа ўліку народнай гаспадаркі.

Бегаюць прадстаўнікі Наргасуліку да прараба **Гінзбурга** і просяць яго:

—**Калі ласка, зрабіце што небудзь, а то нельга працаваць.** Але Гінзбург наўмольны:

—**Нічога зрабіць не магу, таму што няма распараджэньня дырэкцыі.** Гінзбург чакае распараджэньня. А дождж не чакае і ўсякі раз заліває памяшканьне.

Пасьля доўгіх скаргаў і бегапіны Менбуд зрабіў дачасны дах. Але дах мае вялікія шчыліны, праз якія ўсё роўна прапякае вада і не дае магчымасьці працаваць. Апрача гэтага псуецца будынак.

Менбуд урэшце павінен пакласьці канец цяганіне і хутчэй узяцца за заканчэньне надбудовы.

Бірштэйн.

Ня выканалі пляну сяўбы

(*Ліст калгасьніка*)

Мікуліцкі сельсавет, Брагінскага раёну, плянаў веснавой сяўбы ня выканаў. Калгасы плян выканалі на **73 проц.** і адпасобнікі на **43 проц. Недасеў складае 300 га пахаці.**

Невыкананьне сяўбы тлумачыцца **слабай работай сельсавету** па кіраўніцтве пасеўкампаніі. **Сельсавет больш займаўся выкананьнем «прыгожых» пастаноў, чым непасрэдным канкрэтным кіраўніцтвам сяўбой.**

Злачынна сарвалі выкананьне пляну сяўбы правых культур замежнікі сельсавету.

Незасеяную зямлю трэба **скарыстаць пад засеў грэчкі. Мікуліцкаму сельсавету** трэба вылезьці з **канцылярыі** і па-бальшавіцку ўзяцца за ліквідацыю недасеву.

Станковіч.

Скарыстоўваюць не па прызначэньні

(*Ліст студэнтаў*)

Паводле дагавору, заключанага паміж **Менскім торфтэхнікумам** і торфазводам «Бальшавік», студэнты, якія на кіроўваюцца на практыку на завод «**Бальшавік**», павінны **скарыстоўвацца на тых работах, якія больш за ўсё маюць датычэньне да іх вучобы.**

На справе атрымліваецца адваротнае. Нас скарыстоўваюць больш за ўсё на падзённыя чорныя работы, якія ня маюць нічога агульнага з тымі задачамі, якія пастаўлены перад нашай практыкай.

На заводзе ёсьць фрэзэры і **фармовачны** спосаб здабычы торфу. Але нас на гэтых работах не скарыстоўваюць, а адсылаюць на такія работы, якія нічога **не даюць для нашай вучобы.** Пасьля такой практыкі студэнты вяртуцца ў тэхнікум бяз тых ведаў, якія яны **павінны атрымаць на торфазводзе.**

Ал.

Калгас ня мае лістаносца

(*Ліст калгасьніка*)

Праўленьне калгасу «**Чырвоны фізкультурнік**», **Лёзьнянскага району**, ня выканала пастановы аб вылучэньні лістаносца. Праўленьне калгасу ня цікавіцца пытаньнем культурнага абслугоўваньня калгасьнікаў. **Газэты, кнігі дастаўляюцца не рэгулярна.**

У калгасе быў лістаносец, які працаваў добрасумленна, але **старшыня калгасу зьняў яго з працы за тое, што ён не хацеў разам з ім выпіваць.** Праўленьне калгасу «**Чырвоны фізкультурнік**», на чале якога стаіць пяздольны кіраваць калгасам старшыня, **зрывае прасоўваньне газэты і кнігі ў калгас.**

Аб гэтых фактах я пісаў у райгазэту «**Ленінскі шлях**» і «**Калгасьнік Беларусі**». Але гэтыя газэты не палічылі патрэбным рэагаваць на мае допісы.

Я прашу «**Зьвязду**» ўказаць нашаму калгасу месца, якое займае культурна-масавая работа сярод калгасьнікаў. **М.**

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» зварачае увагу **Лёзьнянскага райкалгасаюзу** на **неабходнасьць арганізацыі рэгулярнай дастаўкі газэт і інш. у калгасе «Чырвоны фізкультурнік».**

Нам пішуць

***

Хлебапякарня Рагачоўскага райспажыўтаварыства сыстэматычна дае хлеб нізкай якасьці. Хлеб недапечан Бываюць ў хлебе розныя трэскі і. д.

У крамы хлеб дастаўляецца **ў антысанітарным выглядзе** таму, што хлеб возяць на непакрытай і брудная фурманцы.

Грыгор'еў.

***

29 мая начальнік перасовачнай школы Асоавіяхіму **Віньчык** і камісар тэй-жа школы **Мацулевіч** праводзілі абсьледаньне **Бешанковіцкай раённай арганізацыі Асоавіяхіму.**

Гэтыя гастралёры напісалі акт аб тым, што раённая арганізацыя ў дрэнным становішчы, **не пабываўшы ні ў адзай ячэйцы Асоавіяхіму.**

Лібікін.

***

Начальнік пятай дарожнай дыстанцыі (Магілеў) **Васільлеў** ігнаруе палітмасавую работу сярод рабочых. Іспаваўшы ленкуток на працягу аднаго месяца, паводле **загаду Васільлева, перакідваўся тры разы з аднаго памяшканьня ў другое.**

Васільлеў нават выказаў думку, што ленкуток зусім непатрэбен таму, што няма каго абслугоўваць. **Гэты гора-начальнік**, заяўляючы такую бязглуздзіцу, нібы ня ведае, што на дарожнай дыстанцыі **працуе 200 чал. рабочых.**

ПА СЬЛЯДОХ ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ

У «**Зьвязду**» паступіла заметка «**Зьвязда**», **дапажы!**», у якой указывалася, што ў **Бялыніцкім раёне** кіраўнікі **леспрамгасу Ашуцін, Махоркін** і **Кіндзіраў** займаліся самазабесьпячэньнем, у выніку чаго рабочыя не атрымлівалі пайка па працягу 3-х месяцаў. Плацежныя ведамасьці складаліся са столі, прыдумвалі табэль работ.

Бялыніцкая РКК-РСІ, расьсьледаваўшы гэты факт, пастанавіла **Кіндзіраву зьняць з працы, парт'ячэйцы і рабочкому вынесена вымова.**

***

Селькор з **Брагінскага** раёну напісаў у «**Зьвязду**» аб тым, што сакратар **Астрагляўскага сельсавету Лабачоў** зьдзекваўся з сялян. Разбазараў дзяржаўныя тропы, абараніў кулакоў і заможнікаў.

Прыведзеныя факты пацьвердзіліся. Брагінскі РК ЛКСМВ пастанавіў **выключыць Лабачова з рэдоў камсамолу** і зьняць з працы. **Для прыцягненьня да адказнасьці справу перадаць у суд.**

***

З **Аршанскага** раёну селькор паведаміў, што дырэкцыя і рабочком сьвінагадоўчага саўгасу «**Бабічны**» **не праводзяць ніякай масава-выхаваўчай работы.** У саўгасе наглядзецца **безгаспадарчасьць**, падзеж сьвіней ад хваробы з прычыны слабага лячэньня.

Пры расьсьледваньні прыведзеныя факты **поўнасьцю пацьвердзіліся. Аршанская РКК РСІ абязьсьціла дырэктару саўгасу вымову.**

***

Рабкор напісаў у «**Зьвязду**», што ў **Брагінскім райбанку** працуе загадчыкам банку рабочы-вылучэнец **Каплан.** Кіраўнікі Менскай канторы Дзяржбанку **Фэльдман** і **Чарняк** замест дапамогі **Каплану** стараліся падарваць яго аўтарытэт, зьняць з працы.

Пры расьсьледваньні **факты пацьвердзіліся.** Брагінскі РК КП(б)Б пастанавіў, **што Каплан адпавядае свайму прызначэньню** і павінен застацца на сваім месцы. **Прасіць Менскую РКК РСІ разгледзець справу адносна цкаваньня рабочага-вылучэнца з боку Фэльдмана і Чарняка.**

Месячнік штурму бездарожжа

АПОШНІЯ ДНІ МЕСЯЧНІКА ЗРАБІЦЬ САПРАЎДЫ ШТУРМАВЫМІ

НА РАДЫЁ-ПЕРАКЛІЧЦЫ РАЙШТАБАЎ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ МЕСЯЧНІКА ШТУРМУ БЕЗДАРОЖЖА

У чым прычыны адставаньня?

Зводка выкананьня пляну працудзелу вясковага насельніцтва ў дарожным будаўніцтве за чацьвертую пяцідзеўку месячніка (з 25 чэрвеня па 1 ліпеня) паказвае, што тэмпы работ па мясцох амаль не зьмяніліся. Па 53-х раёнах на 1 ліпеня гадавы плян па выхаду фурманак выкапан усяго толькі на 11,5 проц. і рабсілы па 16,6 проц.

З мэтай выяўленьня сапраўднага становішча 5 ліпеня рэдакцыяй газэты «**Зьвязда**», радыёгазэтай «**За бальшавіцкія тэмпы**» і **цэнтральным штабам па дарбудаўніцтве пры ЦК КП(б)Б была арганізавана радыё-пераклічка**

6 гадзін вечара. У апаратнай закончана апошняе падрыхтаваньне. Мікрафон паведамляе:

— Уступнае слова ад цэнтральнага штабу па дарбудаўніцтве мае начальнік Галоўдартрансу тав. **ФРУМКІН.**

—Прайшло ўжо больш 2 дзкад мясячніка, аднак, цэнтральны штаб прымушаны канстатаваць, што тэмпы работы вельмі нізкія. Сярод найбольш адстаючых зьяўляюцца раёны, якія сёньня прымаюць удзел у радыё-пераклічцы. У радзе выпадкаў раённыя штабы літаральна бязьдзейнічаюць. Нізкія тэмпы работы паказваюць на невыстарчальныя мерапрыемствы па разгортваньні масава-растлумачальнай кампаніі, на арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва і т. д.

У бягучым месячніку мы бачым новыя формы ўдзелу пралетарыяту ў дарожным будаўніцтве. Гэта выяўляецца ў масавых суботніках дапамогі дарбудаўніцтву. 25 тысяч працаздзён ужо аддана пралетарыятам СССР справе дарожнага будаўніцтва.

Цэнтральны штаб патрабуе, каб на працягу бліжэйшых 10-15 дзён былі забясьпечаны сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы, каб давесьці працудзел вясковага насельніцтва да 100 проц.

Першым атрымаў слова для інфармацыі аб ходзе месячніка член Менскага гарадзкога штабу тав. **АЗЕРСКІ.**

Доўгі пералік праведзеных у пачатку месячніка нарад і сходаў. Гэта паказвіна пацьвердзіць, што масавая работа была разгорнута добра. Але як зараз? Ці ёсьць апэрацыйнае кіраўніцтва, практычная дапамога мясцом?

Было мабілізавана 100 чалавек гарадзкога актыву для праўдзеньня растлумачальнай работы па сельсаветах,—гаворыць т. Азерскі.

Мабілізавана... Але колькі выехала, колькі зараз знаходзіцца ў вёсках і калгасах, што яны прарабілі там, якая масавая работа праводзіцца зараз,—адказу на гэта ў прамове тав. Азерскага ня было, як ня было і адказу на пытаньне, па якіх прычынах раён на 5 ліпеня выканаў плян па фурманках толькі на 30 проц. і рабсіле на 28 проц.

Пралетарыят гор. Менску паказаў бальшавіцкія ўзоры барацьбы за добрыя дарогі. Гэта тым больш не апраўдвае адставаньня вёскі. Тав. Азерскі прызнаў, што выкананьне пляну працудзелу ідзе нездавальняюча.

Вельмі няўдала заняў пазыцыю аб рэны сваёй бязьдзейнасьці **Магілеўскі** райштаб. На 4 ліпеня па гэтым раёне плян выхаду рабсілы выкапан на 36 проц. і фурманак на 19 проц.

Прадстаўнік райштаба т. **РАТКЕВІЧ** у апраўданьне заяўляе:

— Адставаньне тлумачыцца тым, што такія арганізацыі, як райпрафсавет, не мабілізавалі ўвагі грамадзкасьці. Райком камсамолу замест арганізацыі сапраўднай барацьбы за ліквідацыю прарыву абмяжоўваецца шматлікімі парадныемі абяцаньнямі. 30 брыгадзіраў, якіх ён абавязаўся выслаць у сельсаветы, да гэтага часу ня выехалі. Райком камсамолу абавязаўся даць 1.500 працаздзён, а на 29 чэрвеня адпрацавана толькі 199. Невыстарчальна ўвагі месячніку аддаецца і рэдакцыяй «Камунар Магілеўшчыны».

У правале месячніка т. **Раткевіч** шукае вінаватых замест таго, каб прызнаць бязьдзейнасьць у першую чаргу райштаба, слабую дапамогу і кіраўніцтва з боку райкому КП(б)Б і райвыканкому. Дырэктыў, бачыце, дана шмат і таму вінават толькі гарпрафсавет, РК КСМ і рэдакцыя раённай газэты. Райштаб жа ня ў стане ўзьдзейнічаць на работу гэтых арганізацый, ён бездапаможны. Напомнім магілеўскаму райштабу, што ён нават не дабіўся, каб пытаньне аб гэтым было абгаворана на прэзыдыуме РВК і бюро РК.

Пра масава-растлумачальную работу т. Раткевіч прымушан сказаць: штаб лічыць, што да гэтага часу масавая работа як на вёсцы, так і ў горадзе разгорнута невыстарчальна і таму для выкананьня пляну месячніка штаб вызначае ў далейшым рад канкрэтных мерапрыемстваў для мабілізацыі ўсёй грамадзкасьці.

Слуцкі райштаб да апошняга часу працаваў дрэнна. Тав. **КАБАКОЎ**—прадстаўнік райштаба не хацеў гэтага прызнаць у сваім выступленьні, хаця гэта ацэнка і запісана ў спэцыяльнай пастанове бюро райкому партыі.

Няма сумненьня, што ў нізкіх тэмпах выкананьня пляну—20 проц. па рабсіле і 21,5 проц. па фурманках вінават ня толькі райштаб, але і мясцовыя арганізацыі, якія яму не дапамагаюць. Аднак, райштаб не знаходзіць больш каго абвінаваціць, як «прафсаюзы гораду прымаюць невыстарчальны ўдзел у гэтай рабоце» і «паскараецца дрэнны ўдзел гаспадарчых арганізацый». Гэта ў той час, калі прафсаюзы ўсё-ж правялі рад суботнікаў і па 6 ліпеня павінна было выйсьці яшчэ 300 чалавек.

Невыпадкова прадстаўнік дарожнага вучастку т. **ЗОЛАТЦАЎ**, які замяняў начальніка Барысаўскага райштаба, у сваёй інфармацыі абыйшоў пытаньне аб масавай рабоце. Яе фактычна няма. На заданае пытаньне аб гэтым, т. Золатцаў быў прымушан прызнаць, што «з 10 па 15 чэрвеня такая работа (?) праводзілася. На сёньнішні дзень тэмпы зьнізіліся». Ня дзіва пасьля гэтага, што плян выхаду рабсілы выкапан толькі на 9,7 проц. і фурманак на 17 проц.

Добрыя ўзоры паказвае **Крупскі** раён. Актыўным удзелам усіх арганізацый ён сапраўды мабілізаваў масы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—адпасобнікаў вакол задач месячніка. У выніку за адну толькі другую дэкаду плян па фурманках выкапан на 65 проц. і рабсіле на 15 проц.

Тое, што паведаміў прадстаўнік Віцебскага гарштабу т. **КРАМЗІН**, амаль нікольні не адрозьніваецца ад «самакрытычных» выступленьняў папярэдніх прамоўцаў.

— Дырэктывы даны своячасова, але... **камсамол нічога не зрабіў**, Аўтадор амаль ніякага ўдзелу ня прымае і г. д.

Самае слабае месца—працудзел вясковага насельніцтва. Плян па рабсіле выкапан на 15,4 проц. і фурманках на 4,3 проц. Рабочых суботнікаў было ўжо 22.

Як відаць, невыпадкова на радыё-пераклічку не зьявіўся начальнік Полацкага райштаба т. **НЕРАТАЎ.** Мусіць няма чым нават тлумачыць сваю бязьдзейнасьць. Сапраўды выкананьне пляну на 11,8 проц. па фурманках і 30 проц. па рабсіле на 1 ліпеня—лічбы, якія нічым іншым нельга вытлумачыць, як бязьдзейнасьцю.

У заключнай прамове прадстаўнік «Зьвязды» адзначыў, што справа не ў дырэктывах, а ў жывой практычнай рабоце. А яна пастаўлена дрэнна.

Дзе сапраўдныя прычыны адставаньня? Адказ можа быць адзін—у адсутнасьці апэрацыйнага, жывога кіраўніцтва ходам месячніка, у слабай масава-растлумачальнай рабоце, у невыстарчальнай рабоце па мабілізацыі мас раённага і нізавога друку.

Толькі прыхільнікі апартуністычнай «чарговасьці» кампаніі могуць высоўваць як апраўдальныя матывы ганебна нізкіх тэмпаў дарбудаўніцтва наяўнасьць іншых баявых работ. Іменна, на аснове ўменьня па-бальшавіцку спалучаць важнейшыя задачы дня, такія раёны, як **Стара-Дарожскі** і **Крупскі**, ледзь ня выканалі ўжо гадавое заданьне.

Каб забясьпечыць круты пералом у ходзе работ па дарбудаўніцтве, неабходна мабілізаваць актыў на правядзеньне шырокай масава-палітычнай работы. Трэба давесьці закон ураду і нормы да кожнай вёскі і калгасу, трэба ўцягнуць у сацыялістычнае спаборніцтва найшырэйшыя масы працоўных, арганізаваць спаборніцтва паміж цэлымі вёскамі, калгасамі, сельсаветамі, ячэйкамі камсамолу, Аўтадору і г. д.

Тэмпы барацьбы за выкананьне пляну трэба ўдесяцярыць. Абвесьцім бальшавіцкі штурм па ліквідацыі адставаньня.

Д

ЗА МЯЖОЙ

ПАРЫСКІЯ „ИЩЕЙКИ“ АСКАНДАЛІЛІСЯ

ПАРЫЖ, 7. (Уласн. інфармацыя «Правды»). Паліцэйскі блёф з «ваенным шпіянажам» рабкораў «Юманітэ» прыкметна паліняў. Кампанія казённай прэсы згортваецца да новага сыгналу зьверху.

У цэнтры суматошнай рэклямы аб «камуністычнай змове» стаяў ваенны завод у Натлеры, рабкоры якога абвінавачваліся ў тым, што яны нібы перадалі Ранайя Біру праз сакратара сваёй ячэйкі чарцёж навейшай аўтаматычнай стрэльбы. Потым аказалася, што гэта аўтаматычная стрэльба выпускаецца яшчэ з 1925 году і ніякай ваеннай тайны яна не прадстаўляе.

Тады ахраньнікі прыдумалі новы варыянт: гутарка ідзе аб другім чарцяжы—аб кулямёце, які прызначан для ўзбраеньня ваенных самалётаў. Але і гэта цьверджаньне прэса падае ў няўпэўненых тонах.

Буржуазнае агенцтва «Радыё» пры мушана прызнаць, што **«ищейки» К'япа аскандаліліся.**

«Трэба адзначыць — паведамляе «Радыё» у камунікэ, апублікаваным у радзе газэт,—што калі ў Шатлера і адбываліся гутаркі паміж сакратаром камітэту кампартыі і некаторымі рабочымі камуністамі, дык у гэтых гутарках ніколі не закраналіся пытаньні шпіянажу. Гутарка выключна шла аб рэвалюцыйнай барацьбе супроць капіталізму. Больш таго, відавочна няма абсалютнай упэўненасьці ў паяўнасьці віноватых, бо ад часу вобыскаў, г. зн. з аўторака 28 чэрвеня ніякіх новых мер ня прымалася».

Генштабная «**Эко дэ-Пары**», падаючы гэтае паведамленьне, дапаўняе яго камічным эпізодам, што разыграўся ў Шатлера паміж ахраньнікамі, якія перастараліся. Прыбылі з Парыжу паліцэйскія камісары, каб правесьці расьсьледваньне незалежна ад мясцовай паліцыі, разьлічваючы на асобную ўзнагароду ў выпадку самастойнага выкрыцьця ніцяй «сэнсацыйнай змовы кампартыі супроць бясьпекі дзяржавы». Мясцовая-ж паліцыя спакушаная тымі-ж пэрспэктывамі разгарнула шалёную сьлежку па вайсковым заводзе і правяла шматлікія бязвыніковыя вобыскі.

У рэзультаце агіднага «спаборніцтва» паміж шпікамі з цэнтру і мясцовымі, апошнія **затрымалі двух парыскіх паліцэйскіх камісараў у якасьці «шпіёнаў»**, заўважаных паблізу тэрыторыі ваеннага заводу. Пасьля таго, як затрыманыя былі прывезены ў вучастак, справа высьветлілася.

Ціпер увесь завод сьмяецца над гэтай прыгодаю к'япаўскіх «ищеек».

* * *

З Парыжу ўл. кар. «Правды» тэлеграфуе: **«Юманітэ»** паведамляе наступнае:

На сходзе ў Сэн-Дэні, да тав. **Дзюртэна** падышоў нейкі суб'ект і спытаў яго, ці не жадае ён узяць пакет з ваеннымі плянамі, якія, моў, цікавяць, кампартыю. Дзюртэн адмовіўся. Некаторы час пасьля ён падзеў капялюш і пакінуў сход. Прыйшоўшы да дому і зьняўшы капялюш ён убачыў, што ў ім ляжаць гэтыя паперы.

Тав. **Фалас** знайшоў у сваім стале зброю, якая відавочна падкінута нейкім правакатарам.

Далей. Нейкі невядомы зьявіўся на біржы працы і пакінуў пакет для сакратара біржы. Калі раскрылі пакет у ім знойдзен быў плян Луарскіх вэрфяй.

Менск перавыканаў плян рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых

ЦК КП(б)Б—т. Гікало, 3-й сэсіі ЦВК БССР, СНК БССР—т. Галадзеду, НКФ СССР—т. Грынько, НКФ БССР—т. Хацкевічу газэце „Зьвязда“

РАПАРТ

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і Менгаркому, па падставе шырока разгорнутай масавай работы і сацспаборніцтва прадпрыемстваў, устаноў і саўгасаў, заданьне па рэалізацыі пазыкі чацьвертага, дзяржаўнага году пяцігодкі сярод рабочых і служачых па горадзе Менску і прыгарадным раёне перавыкананa.

На 7 ліпеня рэалізавана 8.055.300 руб., або 100,6 проц. заданьня. Працягваем работу на 100 проц. ахопе ўсіх рабочых і служачых пазыкай, а таксама па выкананьні і перавыкананьні заданьня па іншых сэктарох (неарганізаванае насельніцтва, калгасьнікі і аднаасобнікі)

Сакратар Менгаркому КП(б)Б ШПЭКТАРАЎ.
Старшыня гарсавету ВАЛОДЗЬКА.
Старшыня гарпрафсавету ШУЛЬКІН.
Загадчык гарфа ДАБРЫН.

Койданаўскія каапэратары працуюць па „палажэньню“

Вечарам 2-га ліпеня намесьнік сакратара Койданаўскага райкому тав. **Атахель**, дзелячыся вопытам работы па разгортваньні калгаснага гандлю заявіў: «Заўтра ў нас будзе вялікі арганізаваны базар». Атахель меў рацыю, але не ва ўсім. Базар адбыўся і нават вялікі, але галоўнага—**аргані заванасьці на самым рынку ня было.**

Базар па сваёй велічыні нагадваў кірмаш. Было ўсё, што хочаце—мяса, масла, яйкі, жывыя парасяты, куры і іншыя прадукты. Вось калгас «Камінтэрн», Рубілкаўскага сельсавету, які яднае 150 гаспадарак і ўжо мае вялізарны вопыт ў гандлі. Два разы ў тыдзень калгас вывозіць на базар у Койданава прадаваць свае прадукты. А адзін раз у тыдзень вязе прадукты для продажу ў Менск. У калгасе нават вылучаны спэцыяльныя коні, прымацован калгасьнік, які едзе на базар. Сёньня-ж калгас прывёз прадаваць вялікую колькасьць малочных прадуктаў. Тут яшчэ дзесяткі калгасаў, сотні калгасьнікаў і аднаасобнікаў прадаюць свае лішкі сельска-гаспадарчых прадуктаў.

Калгас «Зьвязда» прывёз на базар 140 кгр. добрага мяса. Гэты калгас упяршыню выехаў на базар. Доўга думалі калгасьнікі, дзе-б прыладзіцца для разважваньня мяса. Некалькі ларкоў пачаты будаўніцтвам, але не закончаны. Няма дзе рубіць і важыць мяса. На шчасьце калгасьнікі аказаліся запасьлівымі і захапілі з сабой вагі і сякеру. Мяса раскладваецца на дзярузе, зьяўляецца калодка і калгасьнікі прыступаюць да продажу. Побач другі калгас, які прывёз 120 кгр. і таксама доўга шукаў месца дзе-б прыладзіцца для продажу, нарэшце сьледуе прыкладу калгасу «Зьвязда».

Гандаль на рынку ідзе ва ўсю. Працоўныя Койданаўшчыны маюць магчымасьць па даволі танных цэнах купляць усякія прадукты і тлушчы.

Аднак, арганізаваць выезд на рынак гэта яшчэ ня ўсё. Трэба наладзіць сустрэчны паток тавараў, трэба поўнасьцю выканаць пастановы ЦК КП(б)Б аб арганізацыі абслугоўваньня калгасьнікаў, адкрыць цырульні, бюро даведак, пабудаваць вагі для разважваньня і інш. Вось гэтага і не зрабілі койданаўскія арганізацыі.

Базар быў пакінут на волю лёсу.

З арганізацыяй сустрэчнага продажу тавараў каапэрацыя не сьпяшалася. Чатыры ларкі былі наглуха зачынены. Толькі а палове адзінаццатай адчыніліся дзьверы, але продажу яшчэ не рабілася. Прадаўцы, бачыце, заняты былі раскладкай тавараў.

На пытаньне, чаму не гандлююць, загадчык ларка сампрамсаюзу тав. **Кузьняцоў** нават не палічыў патрэбным адказаць, а другі каапэратар, які стаяў побач, праз зубы працадзіў: «Мы працуем па палажэньні, пачынаем гандляваць з 10 гадзін».

А адзінаццатай гадзіне ларкі каапэрацыі пачалі свой гандлёвы дзень. Вось ларок сампрамсаюзу. Цікавімся, ці можна купіць бацінкі. «Не,—кажуць,—мы сёньня прадаем толькі тарфяным арцелям. Побач загатоўленыя для продажу гліняныя гаршкі, міскі і інш. тавары. На пытаньне чаму не прадаеце? пачуўся адказ: «Няма яшчэ расцэнак, ня ведаем як прадаваць».

Ларок гарспажыўтаварыства — ёсьць махорка і іншыя тавары. «Як прадаецца?»—«Толькі па калгасных кніжках». «Ну, а як аднаасобнікам?» —«Адпускаем па даведках сельсавету».

Здалёк, амаль на ўвесь рынак красуецца вялікая размаляваная шыльда «Заля для стрыжкі і брыцьця». Агарожанае дошкамі месца замест залі для брыцьця прадстаўляе сабой проста сьметнік. Тут-жа побач высіцца скромная шыльда «Майстэрня для рамонту абутку», аднак гэта толькі шыльда, а майстэрні так і няма.

Добрыя намеры койданаўскіх арганізацый пакуль толькі выяўляюцца ў шыльдах, далёка ня скончаных ларкох з дрэнна працуючай каапэрацыяй.

Базар 3-га ліпеня з усёй выразнасьцю паказаў, якія невычарпальныя магчымасьці ёсьць у раёне для разгортваньня калгаснага гандлю ўжо зараз, сёньня. Сам факт такога масавага выезду на базар сьведчыць аб вялікай праробленай рабоце койданаўскай парт арганізацыі па папулярызацыі апошніх пастаноў партыі і ўраду сярод шырокіх мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Але гэты базар з усёй выразнасьцю паказаў, што зроблена яшчэ мала. Галоўнага—арганізаванай сустрэчы калгасаў яшчэ няма. У паяўнасьці наўменьне і нежаданьне каапэрацыйных арганізацый паладзіць сустрэчны паток тавараў. Усё яшчэ працуюць па «палажэньні».

Зорбін. Віцеблянін.

Белабандыты на праскім антысавецкім зьлёце

ПАРЫЖ, 6. **(Ул. кар. «Правды»).** Белагвардзейцы старанна рыхтавалися да «усесакольскага зьлёту» ў Чэха Славакіі. Парыскі камітэт садзейнасьці «зьлёту» ўзначальваецца начальнікам **«рускага агульнавайсковага саюзу»** генэралам **Мілерам.** У **чэха-славацкім камітэце** садзейнасьці вельмі выдатную ролю адыгрывае генэрал **Хадаровіч** чыю канцылярыю ў свой час вельмі часта наведваў забойца Думэра Гаргулаў.

Генэрал Мілер даў у сувязі са «зьлётам» спэцыяльнае інтэрв'ю белагвардзейскай газэце **«Возрождение».** З гэтага інтэрв'ю відаць, якія «спартыўныя» мэты мае на ўвазе «зьлёт». Генэрал Мілер гаворыць, што надзвычай **«важна, каб у Празе рускае сакольства было прадстаўлена магчыма паўней»**, або гэты «зьлёт» будзе мець зусім асаблівы характар. Такое значэньне «зьлёту» генэрал Мілер надае таму, што, як піша «Возрождение», у ім прымуць удзел ня толькі сокалы ўсіх славянскіх народнасьцей, але **ўсе часьці армій Антанты, прадстаўнікі дзяржаў,** што прымаюць удзел у «зьлёце». Аб «спартыўных» мэтах «зьлёту» ня мае красамоўна сьведчыць адозва чэха-славацкага камітэту.

«Рускія сокалы, — гаворыцца ў адозьве, — зьявяцца на «зьлёт», як носьбіты рускіх нацыянальных ідэалаў. У цяперашні, бязконца цяжкі час, рускае сакольства набывае асаблівае значэньне. **Гэта той ачаг, дзе ў асаблівых умовах выхаваньня ўмацоўваецца і разьвіваецца руская нацыянальная ідэя. Гэта той ачаг, з якога выйдуць барацьбіты за нацыянальнае адраджэньне Расіі».**

Напярэдадні «ўсесакольскага зьлёту» адбыліся мясцовыя агляды белабандыцкіх малайцоў. У філіялах мілераўскага «агульнавайсковага саюзу» закіпела работа, ажылі «сакольскія» арганізацыі ў **Мэдоне, Ніцэ, Кане,** дзе былі праведзены ўрачыстыя выступленьні сокалаў, да рэчы даволі ня юнацкага ўзросту.

Парыская арганізацыя сокалаў паладзіла 25 чэрвеня спэцыяльны паказ ваенных практыкаваньняў. Мяркуючы па белагвардзейскаму друку, такія-ж «нявінныя» спартыўныя выступленьні мелі месца ў розных краінах, нават на Далёкім Усходзе, у праватнасьці, ў Харбіне і Шанхаі.

На парыскі «зьлёт» з розных краін павінна прыбыць больш 750 белабандытаў, апрача тых, што ўжо знаходзяцца ў Чэха-Славакіі. Аднак лічба ў 650 белабандытаў, якая апублікавана белагвардзейскімі «Последними новостями», яўна перапаменшаная.

Як паведамляе газэта **«Молва»**, што выходзіць у Варшаве больш 400 белых галаварэзаў чакаецца толькі з Польшчы і прыкладна такая-ж колькасьць з Юга-Славіі.

На праскім «зьлёце» паказу белагвардзейскай правакацыйнай і вайсковай тэхнікі вызначаны спэцыяльныя дні. У гэтыя дні ў Празе адбудуцца белагвардзейскія дэманстрацыі, парады і вечары. Само сабою зразумела, што сьледам за адкрытымі выступленьнямі адбудуцца і **нарады з прадстаўнікамі генштабаў, на якіх будзе прапрацоўвацца праграма бліжэйшых антысавецкіх правакацый і выступленьняў.**

Грандыёзныя паветраныя манэўры ва Францыі

ПАРЫЖ, 6. **(Ул. кар. «Правды»).** На 6 ліпеня назначаны грандыёзныя паветраныя манэўры ў Барле, Дзюке, Дыжоне, Крэзо і іншых пунктах. Дыжонскі карэспандэнт **«Юманітэ»** піша:

«У **Дыжоне** панує ўжо на працягу некалькіх дзён сапраўдная атмасфэра вайны. Войскі бязупынна прыбываюць, батарэі займаюць пазыцыі. На звазіцах цэркваў устаноўлены пражэктары. Абсталяваны падземныя камандныя пасты, злучаныя адзін з адным тэлефонамі.

Па сваіх разьмерах гэтыя манэўры перавысяць усе паветраныя манэўры, якія калі-небудзь адбываліся на Францыі. Яны будуць ахапляць фронт даўжынёю 200 кілёмэтраў.

Швэйцарскі ўрад забараніў скліканьне антываеннага зьезду ў Жэнэве

БЭРЛІН, 6. «Журналь дэ Жэнэв» паведамляе, што **швэйцарская дзяржаўная рада забараніла** «пад напорам самых строгіх палітычных прасьледваньняў» **скліканьне ў Жэнэве міжнароднага кангрэсу па барацьбе з імпэрыялістычнай вайной, які арганізуецца Рамэн Ролянам, Анры Барбюсам і інш.** Забарона матывуецца тым, што арганізатары кангрэсу «зьвязаны з замежнымі камуністычнымі арганізацыямі». Кангрэс нібы «носіць чыста камуністычны характар і зьяўляецца сур'ёзнай пагрозай парадку і спакою».

Аварыя амэрыканскага самалёту каля Барысава

МЕНСК, (БЕЛТА). 7 ліпеня пад Барысавам, у выніку папсаваньня апарату, здарылася аварыя амэрыканскага самалёту, які трымаў свой пуць на Маскву, над кіраваньнем амэрыканскіх лётнікаў **Грыфіт і Матэрн.**

Лётнікі, у сувязі з аварыяй самалёту, былі вымушаны зрабіць пасадку ў полі. Пры спуску самалёт быў разьбіт. Лётнікі, як пасьля было высьветлена, атрымалі толькі незначныя параненьні. Пацярпеўшым была безадкладна аказана першая /мэдыцынская дапамога барысаўскімі савецкімі арганізацыямі.

Пасьля атрыманьня ў Менску паведамленьня аб аварыі, Савет Народных Камісараў БССР безадкладна камандіраваў па месца здарэньня прадстаўнікоў ураду і грамадзкіх арганізацый, якімі была аказана папярэдняя патрэбная мэдычная і матар'яльная дапамога.

А 8 гадзіне ўвечары 7 ліпеня лётнікі **Грыфіт і Матэрн** прыбылі сумесна з прадстаўнікамі ўраду ў Менск, дзе ім быў аказаны належны догляд і ўвага.

Настрой лётнікаў бадзёры, здароўе добрае.

Лётнікі Грыфіт і Матэрн выказалі пажаданьне накіравацца ў Маскву, каб там вырашыць пытаньне аб далейшым сваім падарожжы. Прадстаўнікамі ўраду і грамадзкіх арганізацый БССР была арганізована ў гэтых адносінах Грыфіту і Матэрну патрэбная дапамога і садзейнасьць.

Пераначаваўшы ў Менску, лётнікі 8 ліпеня накіраваліся ў Барысаў для ўкладкі ўдалелых частак машыны і далейшага свайго сьледаваньня ў Маскву.

Марксыцка-ленінскае вучэньне аб друку—у праграму навучальных установаў

Надаючы вялізарнае палітычнае значэньне далейшаму разгортваньню рабселькораўскага руху і нізавога друку, калегія Наркамасьветы згадзілася з пастановай усебеларускага зьезду ІТР і пленуму ЦК прафсаюзу асьветы аб увядзеньні з 1932 году ў навучальныя пляны па грамадазнаўстве ва ўсіх вышэйшых і сярэдніх навучальных установах і 7-й групе масавай школы разьдзелу аб марксыцка-ленінскім вучэньні аб друку, пытаньнях рабселькораўскага руху і нізавога друку.

Даручана ДВС уключыць у навучальныя пляны гэту дысцыпліну.

Для складаньня праекту праграмы зацьверджана камісія ў складзе т.т. Баршчэўскай (старшыня), Зярніцкага, Вержбаловіча, Шпітальніка і Праўда.

ДВБ абавязана забясьпечыць выданьне адпаведнага падручніка-хрэстаматыі і іншых патрэбных матар'ялаў.

Даручана Дзяржаўнаму Вучонаму Савету ў двухдэкадны тэрмін даць адпаведныя ўказаньні па пэрыферыі.

САВЕТЫ Ў ЧЫЛІ

У «Правде» надрукавана карэспандэнцыя з Сант-Яго ад 16 чэрвеня: «Саветы ў Чылі», якая дае яснае ўяўленне аб характары тых падзей, якія там адбыліся. Да карэспандэнцыі «Правда» дадае наступныя каментары:

Падзеі ў Чылі прыцягнулі ўвагу да гэбе ўсёй сусьветнай прэсы. Аднак, паведамленьні аб падзеях у Чылі, якія друкуюцца буржуазнай прэсай, былі вельмі адрывачны, супярэчлівы і не давалі магчымасьці меркаваць аб сапраўдным становішчы ў краіне. Ліст, атрыманы намі з Чылі, дае досыць матар'ялу, які асьвятляе падзеі, што там адбыліся, ня гледзячы на тое, што ліст атрыман са значным спазьненьнем.

Паводле апошніх вестак зграя, на чале з Давіла, устанавіла ў Чылі фашысцкую дыктатуру. Кампартыя зноў запанала ў падпольле.

У карэспандэнцыі гаворыцца:

«Пераварот зроблен 4—5 чэрвеня групай Давіла, Грова і Пуга, косіць бязумоўна характар ваеннага путчу і мае адну рысу, якая адрозьнівае яго ад усіх пераваротаў, што адбыліся да гэтага часу ў Паўдзённай Амэрыцы — гэта непрадказаная «сацыялістычная» дэмагогія, якая ўжываецца ініцыятарамі перавороту. Слова «сацыялізмо» і ад яго ўтвораныя ў вялікім ходу. Нават нахрова-рэакцыйная прэса пачакала на гадана стала старонніцай сацыялізму. Як грыбы растуць розныя «сацыялістычныя» партыі.

Злоўжываньні сацыялізмам ня таннае будуць каштаваць буржуазіі і яе новай групе. На плянах мітынгі зьмяняюцца мітынгамі, рабочая маса арганізуецца. Ужо з вечара 4 чэрвеня кампартыя, камсамол вышлі з падпольля. Яны зьявіліся з пачатку ў раёнах «Сант-Яго, выклікаючы жывую зацікаўленасьць у масах.

Кампартыя і ФОЧ (рэвалюцыйныя прафсаюзы ў Чылі) занялі правільную пазыцыю ў адносінах да ўраду Давіла—Грова ,які вышаў у адстаўку і да нового ўраду. 5-га чэрвеня ФОЧ выпусьціла манифэст з заклікам да рабочых арганізацый, вайсковых часьцей, студэнцтва, настаўнікаў выбраць свае дэлегатаў у савет. На заклік адгукнуўся рад важнейшых арганізацый, якія выбралі каля 300 дэлегатаў. 6 чэрвеня ў захопленым будынку унівэрсытэту, пры вялікім скапленьні рабочых адкрыўся савет.

У савеце былі прадстаўнікі: будаўнікі, рабочыя двух мэталюргічных заводаў, дарожныя будаўнікі, дзьвёх сялянскіх арганізацый, прадстаўнік ад паўстаўшых маракаў, трамвайшчыкі, ад рабочых цукровай прамысловасьці, шаўцы і гарбары, санітары, настаўнікі, студэнты.

Савет на працягу 4-х дзён уладаў рабыё. Ён шырока скарыстаў яго для агітацыі па ўсёй краіне і спэцыяльна сярод войск. Было паслана па радыё прызітаньне сусьветнаму пралетарыяту, пралетарыяту СССР, Камінтэрну і Прафінтэрну.

Саветам былі арганізаваны дзьве вялізарныя дэманстрацыі 6 і 14 чэрвеня, якія прыцягнулі тысяч 15—20 рабочых.

16 чэрвеня былі створаны саветы ў наступных пунктах: АРАНКАГУА—раён медзі, Чылькі, Серэна, Кіота, Курыка—раёны сялянскія і Тэтука—ІНДЫЙСКІ РАЁН. (Гэта вельмі важна, бо зьяўляецца першым крокам для сувязі з рухам індыйскіх мас). У САН-АНТОНІО—важны порт. Толькі ў двух буйных цэнтрах саветы ня былі створаны. Савет у Сант-Яго парасьліўся ва ўласны будынак, уступлены ўрадам. Пад націскам мас савет толькі цяпер пачынае зьвязвацца з рабочымі масамі.

У савет усё больш пачынаюць праходзіць дэлегаты з фабрык. Да гэтага часу яшчэ няма сувязі з вайсковымі часьцямі, але роля і значэньне савету ўсё ўзрастае: рабочыя пачынаюць бачыць у савеце свайго адзінага абаронцу. Ня рэдка можна наглядаць, што якая небудзь жоўтая «рабочая» арганізацыя перш чым ісьці з просьбай да ўраду, ідзе ў савет заручыцца яго падтрыманьнем.

Новы «сацыялістычны» ўрад прымушан быў некалькі раз зьвяртацца да савету з просьбай спыніць агітацыю ў войсках, аказаць падтрыманьне ураду. Гэта, зразумела, робіцца ня толькі з-за моцнасьці савету, колькі з-за слабасьці ўраду.

Уплыў КП і ФОЧ моцны. Варта зьвяцца нашаму прамоўцы, як рабочыя масы схіляюцца на яго бок, прымаюць яго прапанову (гэта адбываецца на ўсіх мітынгах, якія арганізуюцца і ўрадавымі «сацыялістычнымі» партыямі). Але труднасьці на шляху разьвіцьця руху вялізарныя.

Кампартыя толькі што выйшла з падпольля. Яна ашчэ не сабрала сваіх сіл для работы. Ідэалёгічна партыя слабая. Вялікім уплывам у партыі карысталася дробна-буржуазная ідэалёгія. Толькі на даўна партыя павяла выразную барацьбу супроць рэнэгатаў, гідальгістаў (тутэйшыя трацкісты), якая яшчэ далёка не закончана. У партыі былі хістальныя адносна пазыцыі ў адносінах да «сацыялістычнага» ўраду. Моцны рост руху патрабуе ад кампартыі і ФОЧ вялікага напружаньня сіл.

Надыходзіць рэакцыя супроць кампартыі, ФОЧ і саветаў (паасобныя факты ўжо ёсьць). Неабходна скарыстаць час для замацаваньня заваяваных пазыцый, для ўстанаўленьня глыбокай сувязі з масамі рабочых, сялян, салдат і маракоў».

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Яшчэ адна мартэнаўская печ

СЬВЯРДЛОЎСК. 2 ліпеня на Верхісецкім заводзе пастаўлена на сушку новая 20-тонная мартэнаўская печ, якая будзе выпускаць трансфарматарную сталь. Першая плаўка павінна быць 16-17 ліпеня.

Новы смалаперагонны завод

КАДЗІЕЎКА. Пушчан новы смалаперагонны завод, абсталяваны паводле апошняга слова тэхнікі. Будаўніцтва заводу абышлося ў 3 млн. руб.

Тры першыя сенакамбайны

СЬВЯРДЛОЎСК. Очарэні завод Уральсельмашу выпусьціў тры першыя савецкія сенакамбайны.

Сельгасмашыны

Завод **«Чырвоны мэталіст»** заданьне трэцяй дэкады чэрвеня выканаў на 20 проц., выпрацаваў прадукцыі па суму 27.898 руб.

Выпушчана 26 жмыхадрабілак, 36 карнярэзак, 44 бульбакапалкі, 56 барон «Зіг-заг» і 6 аднакарпусных плугоў.

Будматар'ялы

Рагачоўскі лесазавод імя Халтурына за 1 ліпеня расьпілаваў 308,6 кбм. мэтраў бярвеньняў, што дае 107,1 проц. дзённай праграмы.

2 ліпеня расьпілавана 316,7 кбм., або 110 проц. заданьня.

* * *

Мэблевым цэхам камбінату **«Камінтэрн»** за 3 ліпеня зроблена 248 штук мэблі, што складае 73,8 проц. пляну за дзень.

* * *

Лесазавод «Спартак» пляц за чэрвень выканаў на 106 проц. Расьпілавана 2.131 кбм. драўніны.

* * *

За шостую пяцідзёўку чэрвеня кафэльня-цэглачным заводам **«Пралетары»** зроблена 59.300 шт. кафляй, або 21 проц. месячнага пляну.

* * *

Завод **«Чырвоны Кастрычнік»** за трацюю дэкаду чэрвеня выканаў 9,6 проц. месячнай праграмы. Выпушчана валавой прадукцыі на 22.118 руб.

Выпрацавана 28,56 тон будаўнічых цьвікоў.

За 3 ліпеня гэтым-жа заводам выпушчана 2,66 тоны цьвікоў, або 23,8 проц. дзённага заданьня.

Папера

Добруская папяровая фабрыка **«Герой працы»** за 1 ліпеня выпусьціла 42,9 тоны паперы, што дае 44,5 проц. пляну за дзень. 2 ліпеня выраблена паперы 49,9 тоны, або 51,8 проц. заданьня.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

ГАРПРАФСАВЕТ на 10-е ліпеня 1932 г. у 8 гадзін вечара, у памяшканьні Гарпрафсавету (плац Волі, был. памяшканьне Наркампрацы, 2-гі паверх, пакой № 1)

склікае

экстраную нараду ўсіх галоўных і старэйшых бухгальтараў

прадпрыемстваў і ўстаноў гор. Менску.

З прычыны асобай важнасьці пытаньня, яўка вышэйпаказаных таварышоў абавязкова.

Летні тэатр саду „Прафінтэрн“ — З 8-га ліпеня зусім абноўленая праграма 3-га цыклю эстрадна-цыркавых паказаў **МЮЗІК-ХОЛ** у 2-х адзд. Пачатак у 9 гадз. веч.

„Чырвоная Зорка“ — Новы савецкі мастацкі фільм **З ЖЫЦЬЦЯ КАРМЕЛЮКА** драма ў 7 частках.

„Інтэрнацыянал“ — Мастацкі фільм Саюзкіно **НЯВОЛЬНІКІ МОРА** Звыш прагр. кіно-хроніка Саюзкіно.

„Пралетары“ Пач.: у 2 гадз. дня. Каса з 12 гадзін. — Мастацкі фільм **З пакоі з кухняй** Звыш прагр. хроніка Саюзкіно.

„Спартак“ Пач.: 5-30, 7-15, 9, 11 г. Каса—з 4 г. — Замежны мастацкі фільм **ЧЫКАГА** драма ў 7 частках.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ **АНОНС!**

НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ГОНАР

вытворчасьці **Белдзяржкіно.**

Кіно „Чырвоная Зорка“

ХТО ЯНА ?

Кожны працоўны павінен наведаць выстаўку!

АДКРЫТА ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ СТАЛАЯ **будаўнічая выстаўка** (у Менску на тэрыторыі былой с.-г. выстаўкі).

Выстаўка ставіць сваёй задачай: шырокую прапаганду будаўнічай тэхнікі, папулярызацыю нашага будаўніцтва, шырокі абмен вопытам і г. д.

Выстаўка мае адделы: будматар'ялаў, канструкцый арганізацыі, мэханізацыі і рацыяналізацыі будаўнічых работ, сантэхнікі, кадраў, прамысловага, шляховага, жыльлёвага і гаспадарчага будаўніцтва.

Выстаўка ўвесь час папаўняецца новымі экспанатамі.

Выстаўка працуе штодзённа ад 10 г. дня да 11 г. веч.

Уваход вольны.

Арганізаваным экскурсіям прадстаўляецца экскурсант.

Дырэкцыя выстаўкі.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ МІКРАБІЯЛЁГІІ І ЭПІДЗМІЯЛЁГІІ

абвяшчае, што з 1-га жніўня 1932 г.

адкрываюцца 3-месячныя КУРСЫ па падрыхтоўцы дэзынфэктараў.

На курсы прымаюцца асобы, скончыўшыя школу 1-й ступені і былыя чырвонаармейцы, якія ў Чырвонай армії працавалі ў якасьці санітараў і дэзынфэктараў.

Усе слухачы забясьпечваюцца пэнсіяй дэзынфэктараў, а некаторыя будуць забясьпечаны на час вучобы інтэрнатам.

Па сканчэньні курсаў неабходна працаваць на раёне ня менш 2-х год, пасьля чаго курсанты атрымліваюць пераважнае права на прыём у мэдтэхнікум з залікам тых дысцыплін, якія яны праходзілі на курсах (магчыма прыём на 2-гі курс мэдтэхнікуму).

Заявы падаваць на імя інстытуту—Менск, Нова-Маскоўская, 60.

Даводзіцца да ведама ўсіх грамадзян, што з 3-VII

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА

„ТОРГСІН“ ПЕРАМЯСЬЦІЛАСЯ Ў НОВАЕ ПАМЯШКАНЬНЕ па Камсамольскай вул. № 15, „ТОРГСІН“.

НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ РАХУНКОВЫХ КАДРАЎ БЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ „СОЮЗОРГУЧЕТ“

абвяшчае набор слухачоў у **5-ці месячную групу старшых бухгальтэраў** для саўгасаў **НАСЕНТРЭСТУ**

На курсы прымаюцца асобы са стажам памбуха, або рахункавода са стажам ня нізкай 2-х год.

Стыпендыя 125 р. у месяц і кватэрныя 15 руб. Інтэрнатам слухачы не забясьпечваюцца. Слухачы прымаюўваюцца да сталоўні.

Пасьля сканчэньня курсаў слухачы павінны працаваць ня менш 2-х год у саўгасах Белнасеннаводтрэсту.

Заявы патрэбна накіраваць па адрасе: Менск, Міхайлаўская вул. 1-4, 3-я школа. Навуч. камбінату „Союзоргучет“.

Да заявы абавязкова прыкладаць дакументы:

1) аб сацыяльнавышчы, 2) аб адукацыі, 3) аб узросьце і 4) аб працоўным стажы, а калгасьнікі, служачыя і рабочыя —дадаткова згоду свайго праўленьня, установы, або прадпрыемства аб адсутнасьці супярэчнасьцяй для паступленьня на курсы.

Апошні тэрмін падачы заяў—15-VII.

Заявы без дакументаў не разглядаюцца.

Навуч. Камбін. „Союзоргучет“.

МЕНСКІ АРХІТЭКТУРНА-БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ (былы палітэхнікум)

абвяшчае **ДСЕНЬНІ НАБОР** студэнтаў на будаўнічае аддзяленьне дзённага і вечэрняга рабочага тэхнікуму.

Прыём разьлічан на 470 чалавек, з якіх 60 чалавек па горнае аддзяленьне.

МАБТ рыхтуе спэцыялістаў тэхнікаў-прарабаў на ступных спэцыяльнасьцях: а) фабрычна-заводзкай, б) агрэгідуастрыяльнай, в) вазьленьня і рэнта ляцыі, г) водазабясьпечваньня і каналізацыі, д) жыльлёвага будаўніцтва.

Тэрмін навучаньня ў дзённым тэхнікуме—3 гады і ў вечэрнім—4 гады.

Прынятыя ў тэхнікум забясьпечваюцца стыпэндыяй.

Адукацыя для паступленьня ў тэхнікум патрабуецца—7-годка або падрыхтоўчыя курсы.

Жадаючыя паступіць павінны представіць дакументы па адрасе: Менск, архітэктурна-будаўнічы тэхнікум, вул. Карла Маркса, 37.

Да дакумантаў прыкладваюцца: заява з указаньнем аддзяленьня і спэцыяльнасьці, заверэная анкета, даведка аб сац. паходжаньні, даведка аб працоўным стажы паступаючага, мэтрычная выпіс аб годзе нараджэньня, дакумант аб адукацыі, даведка аб здароўі, характарыстыка ад грам. арганізацыі, 2 фотакарткі і паштовыя маркі для адказу.

Прыём заяў з 1 жніўня г. г.

Аб пачатку заняткаў будзе абвешчана асобна.

Дырэкцыя тэхнікуму.

РАБФАК Беларускага хэміка-тэхналёгічнага інстытуту

— абвяшчае —

асеньні набор на 1, 2 і 3 курс рабфаку.

На 1-шы курс прымаюцца рабочыя і калгасьнікі без адрыву ад вытворчасьці з вытворчым стажам ня менш 3-х год. Студэнты 2 і 3 курсаў забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмерах ад 30 да 65 руб. Інтэрнатам. Дакументы прадстаўляюцца, згодна даведніку НКА ў арыгіналах. Для заказу прыкладасьці маркі на 30 кап. На 1-шы курс прымаюцца з ведамі 4-х груп сямігодкі, на 2-гі курс—6, на 3-ці—7 груп. Заявы прымаюцца з 1-га ліпеня па 25 жніўня ў канцылярыі рабфаку з 9 да 4 гадз. дня. Пачатак заняткаў на 1 курсе—1 кастрычніка, на 2 і 3 курсах—1-га верасьня.

Адрас: Менск, Замляробскі заз. № 4.

Кіраўніцтва рабфаку.

Менскі хэміка-тэхналёгічны тэхнікум ХАРЧОВА-БРАДЗІЛЬНЫХ ПРАЦЭСАЎ

абвяшчае з 5-VII—32 году на 5-IX—32 г. АСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў на аддзяленьні:

1) крахмала-патачнае на 30 асоб; 2) вінакуранае на 60 асоб; 3) кандзіцерскае на 30 асоб.

Тэхнікум з 3-гадовым навучаньнем рыхтуе тэхнікаў-тэхналёгаў перапічаных галін прамысловасьці. Умовы прыёму тыя-ж, што і для іншых індустрыяльных тэхнікумаў. Да заяў з дакумантамі абавязкова прыкладаць 2 фотакаркі, паштовых марак на 40 кап. у заяве указаць на якое аддзяленьне жадае паступіць. Усе дакументы падаваць у арыгіналах. Прыём заяў штодзённа ад 10 да 4 гадз. у канцылярыі тэхнікуму, вул. 5, 10, 15, 20, 25 і 35.

Адрас: **Менск, Падгорны заз. № 7.**

Дырэкцыя тэхнікуму.

ЧЭРЫКАУСКІ (б. Круглянскі)

ВЭТЭРЫНАРНЫ ТЭХНІКУМ

абвяшчае, апрачаасьненьняга набору на 1 курс тэхнікуму ў колькасьці 60 асоб, таксама асеньні набор на

10-месячныя вэтфельчарскія курсы

ў колькасьці 60 асоб. На курсы прымаюцца асобы з адукацыяй у абсяге 5-6 груп сямігодкі. Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Да заяў далучаюцца дакументы, як і для паступлен